2. Вопреки статье 34 Конституции, которая гарантирует гражданам Республики Беларусь право на получение, хранение и распространение полной, достоверной и своевременной информации о деятельности государственных органов ... в законопроекте (ч.2 ст.36) государственные органы, политические партии, другие общественные объединения, иные юридические лица, а также их должностные лица **могут** *(подчеркнуто авт.)* предоставлять сведения о своей деятельности средствам массовой информации ...

3. Исходя из требований статьи 34 Конституции недопустимо вводить в законопроект информацию "ограниченного доступа" (ст.37). Еще более недопустимо завершать список такой информации нормой отсылочного характера – "иной информации, предусмотренной законодательными актами Республики Беларусь".

4. Вступает в противоречие со ст.ст. 33 и 34 Конституции норма законопроекта (ст.38), согласно которой в СМИ запрещается распространение информации от имени организаций, не прошедших в установленном порядке государственную регистрацию (перерегистрацию).

5. Противоречит Конституции (ст.13) требование о проведении сплошной перерегистрации СМИ после вступления закона в силу (с января 2009 г.).

Хотелось бы надеяться, что эти "подсказки" будут приняты во внимание судьями Конституционного суда при проверке конституционности указанного законопроекта, который вызвал крайне негативную реакцию как белорусской, так и международной общественности.

***

В завершение можно согласиться со словами нынешнего председателя Конституционного суда Республики Беларусь П.П.Миклашевича в интервью корреспонденту газеты "Советская Белоруссия": "Декрет, по сути, открывает новую страницу истории в деятельности Конституционного суда Беларуси. Наделение Конституционного суда дополнительными полномочиями позволит решать самые сложные юридические вопросы, напрямую связанные как с правами и свободами граждан, так и с работой государственных органов" (см.: газета "Советская Белоруссия", 28.06.2008).

Посмотрим, к чему приведет Конституционный суд это "декретное правотворчество". Отметим лишь, что такого эксперимента еще не было в мировой практике. Так что мы вновь впереди планеты всей...

Народная Воля
http://www.nv-online.info
10 ЛІПЕНЯ 2008 г.

ДЫСКУСІЯ

Чаму ахвяры так любяць сваіх катаў?

Адкрыты ліст Алегу Волчаку

Паважаны спадар Волчак! Ваша "Открытое обращение к участникам войны в Афганистане "Защитимся!" выклікае ў мяне глыбокі роздум і пэўныя пярэчанні. І вось чаму: занадта позна вы спахапіліся. Пачынаць змаганне за свае правы патрэбна было яшчэ больш за 20 гадоў таму. І большай, як зараз, сілай, калі ўдзельнікаў той вайны было на Беларусі прыкладна сорак тысяч, а не дзесяць...

Яшчэ лічу, што патрэбна было дамагацца прызнання ўсіх "афганцаў" ахвярамі камуністычнага рэжыму і публічнага асуджэння авантуры СССР у Афганістане як злачынства супраць чалавецтва. Але і па сённяшні дзень я не знайшоў у вас вызначанай фурмулёўкі на гэты конт, усё неяк замаскіравана, размыта... Пасля Другой сусветнай вайны нацыянал-сацыялізм (фашызм) у Германіі быў рашуча асуджаны і забаронены. Паважаны спадар Алег, вы, вучоны юрыст, чамусьці не праводзіце рысу роўнасці паміж сіямскімі блізнятамі па сваёй ідэалогіі і дзейнасці – гітлераўскай і камуністычнай партыямі. Хіба не КПСС адпраўляла 18-гадовых беларускіх (як і з іншых савецкіх рэспублік) юнакоў на смерць і пакуты за чужыя інтарэсы, дзеля панавання сваёй антычалавечай ідэалогіі?

Тады з нашай дзесяцімільённай Беларусі было адпраўлена на афганскую вайну больш як сорак тысяч чалавек. Прапорцыя адносна колькасці насельніцтва - большая, чым на іншых СССРэаўскіх абшарах. А значыць, і ахвяры былі большымі. Зноў жа – у імя чаго? Адно ясна: пакорлівых і маўклівых выкарыстоўваюць у першую чаргу.

Добра памятаю, як падчас агрэсіі ЗША супраць В'етнама многія матулі амерыканскіх юнакоў кідаліся на рэйкі перад цягнікамі, на ўзлётныя палосы, перашкаджаючы адпраўляць сваіх сыноў на смерць. Нашы ж беларускія матулі спявалі парасійску савецкія песні, кідаліся ў скокі, калі іх сыноў гналі немаведама куды на гібель. А калі дадому, замест дзяцей прывозілі" ў трунах "груз-200", дык многія бацькі яшчэ дзякавалі ўладам, што іх крывіначак хавалі на мясцовых могілках з ганаровай вартай і аказвалі гонар сваёй прысутнасцю дырэктар школы ці калгасная даярка-дэпутатка са словамі пра "свяшчэнны інтэрнацыянальны доўг"...

Ні адна беларуская маці не выйшла на плошчу з плакатам пратэсту. Падобна, прывід камунізму быў ім даражэйшы, чым родныя сыны... Прабачце, дарагія людзі, за гэты горкі папрок, але ад праўды не схаваешся. Хоць зараз варта паглядзець ёй у вочы.

А што здарылася з хлопцамі, якім пашанцавала вярнуцца з таго пекла? У суладдзі са здаровым сэнсам яны б павінны былі зненавідзець антычалавечы рэжым і ўліцца магутным патокам у дэмакратычны рух за вызваленне Беларусі ад каланіяльнай залежнасці ад Расіі, каб больш ніколі нашы суайчыннікі не гінулі за чужыя імперскія інтарэсы. Маглі б падтрымаць Беларускі Народны фронт "Адраджэньне", які вёў дзеля гэтага мужнае змаганне. Але таго, вядома, не здарылася. На прэзідэнцкіх выбарах 1994 года, наколькі я ведаю, за Зянона Пазьняка з ліку пакутнікаў афганскай вайны прагаласавалі толькі адзінкі... А вось настальгія па СССР у "афганцаў" не мае межаў! Штогод 15 лютага ў нас у Пружанах, без усялякіх замоўленасцяў і дазволу з боку мясцовых улад, у самым цэнтры горада збіраюцца на свой мітынг "інтэрнацыяналісты". Колькі там пафасу і колькі стогну па вялікай імперыі зла! Зла, якое яны спазналі на сабе, але сутнасць яго так і не зразумелі. Колькі праклёну на адрас НАТО і беларускай апазіцыі, колькі пахвалы сучаснай уладзе. Дзіву даешся той бяздумнасці, слепаце.

Нездарма, калі пісьменніца Святлана Алексіевіч выдала праўдзівую, суровую дакументальную кніжку "Цинковые мальчики", усчаўся сапраўдны вэрхал. На яе абрынулі патокі паклёпу, нянавісці, абраз, распачалі судовы працэс... І ў першую чаргу ўсё гэта ішло менавіта ад "афганцаў", многія з якіх між тым самі спавядаліся ў перажытым мужнай пісьменніцы. І павінны былі б дзякаваць і цалаваць рукі спадарыні Алексіевіч, што давяла страшэнную праўду да ўсяго свету. Толькі на такую мужнасць у іх духу не хапіла: браць пад казырок перад афіцыйнай уладай куды лягчэй і бяспечней.

Спадар Алег, Вы сябе называеце інтэрнацыяналістам і ганарыцеся гэтым. Так працягваюць называць сябе ўсе "афганцы", якія, хоць і не па сваёй волі, зусім не з мірам прыйшлі на далёкую ад Беларусі зямлю. Ні ў якім разе я не кідаю вам дакор за тое, што апынуліся там. Вы выконвалі загад і прайшлі праз пекла! Усёй душой спачуваю вам і вашым родным за ўсе пакуты. Але ж мінула шмат часу – здаецца, дастаткова, каб асэнсаваць і пераасэнсаваць тое, што было. Аднак... Не скажу пра ўсіх, а некаторыя і дагэтуль жывуць з закінутай ім у душы атрутай, пры настальгіі аб СССР. І зусім не палымнеюць любоўю да ідэй незалежнасці, дэмакратыі, не шануюць родную мову. Што ж добрага ў такім "інтэрнацыяналізме"? У свае 70 гадоў мне ўсяго давялося пабачыць, быць у розных пераплётах, не раз "вісець на валаску". І – многае зразумець. Ды вось аднаго ніяк не ўцямлю: чаму ахвяры так любяць сваіх катаў? Бывае, нават болей, чым родных матуль...

Вы, спадар Алег, бачу, ганарыцеся сваімі медалямі. Вядома, узнагарода, атрыманая ў абароне незалежнасці сваёй Бацькаўшчыны, – вялікі гонар. Вы ж атрымалі ўзнагароду з рук тых, хто Вас прымушаў паміраць, як даўно ўжо відавочна, за чужыя інтарэсы. Калі называць рэчы сваімі імёнамі, то - атрымалі з рук сваіх катаў і, бадай, не задумваліся, што на гэтых медалях блішчаць слёзы беларускіх і афганскіх матуль, што на іх запяклася кроў сапраўдных афганцаў, якія ніколі і нічым не пагражалі Беларусі. Яшчэ раз выбачаюся за сваю рэзкасць, але мне баліць, напэўна, не менш, чым Вам.

...Калі вас, удзельнікаў той вайны, было яшчэ шмат, улады мусілі з вамі лічыцца, давалі кватэры, крэдыты, нейкія льготы. Зараз вас ужо куды менш, і ўладам вы ўжо не так, як раней, патрэбны – не тая сіла! А была - "тая"! Яшчэ памятная сярэдзіна 80-х гадоў, калі на дзяцей, што ладзілі разам з настаўнікамі-мастакамі свята "Гуканне вясны" ў Траецкім прадмесці, улада кінула менавіта "афганцаў". І тыя, не задумваючыся, пэўна, што робяць, па-зверску збівалі дзяўчатак, хлопчыкаў і знаных творцаў, што былі з моладдзю... Мне, хлопцы-"афганцы", па-бацькоўску шкада ўсіх вас, хто скалечаны не толькі фізічна, а і душой: пакутуе сам, пакутуюць тыя, хто побач.

Наўрад ці многія з былых воінаў-інтэрнацыяналістаў 25 сакавіка на акцыі ў гонар 90-х угодкаў БНР у Мінску трымалі нашы бел-чырвона-белыя сцягі, баранілі дэманстрантаў ад дубінак АМАПа. А якраз вось там, у шэрагах змагароў за незалежнасць і волю Бацькаўшчыны – ваша годнае заўтра, вашы льготы-даброты і ваш чалавечы гонар. Пакуль у кожнага з нас, дзесяці мільёнаў, у вушах не будуць гучаць прарочыя словы, сказаныя Кастусём Каліноўскім перад смерцю, мы так і будзем боўтацца ў дрыгве і енчыць, што дзяржава не паважае...

А сказаў Кастусь з-пад шыбеніцы вось што:

"Бывай здаровы, беларускі народзе,
Жыві у шчасці, жыві ў свабодзе!"

З павагай –
Мікола КАНАХОВІЧ,
афіцэр у адстаўцы.
г.Пружаны.

SOS!

Да ўлады прыбіваецца ўсё больш і больш шэрых людзей

Я чалавек ужо, як кажуць, сталага веку. Многае пабачыў у жыцці, многае пераасэнсаваў. Але, скажу, не памятаю, каб так ставіліся да разумных людзей, як сёння. Каму сёння шанцуе? Не, не тым, у каго светлая галава, працавітыя рукі, а тым, хто гэтым не можа пахваліцца, а ўмее поўзаць перад начальствам, зазіраць яму ў рот, па-халуйскі выконваць любыя, нават злачынныя, загады.

Прыстасаванцаў вылучаюць на высокія пасады, ім катэджы, машыны, шалёныя грошы. Людзей сумленных адхіляюць ад адказнай работы, звальняюць па надуманых прычынах, цкуюць. Я ведаю чалавека, які нават у савецкія часы лічыўся шэрасцю, лайдаком, дэмагогам. Маральныя якасці яго не раз абмяркоўваліся ў калектыве. Ніхто і падумаць не мог, што з пераменай улады гэты чалавек трапіць у атачэнне Лукашэнкі і будзе сядзець у мягкім крэсле на адным з паверхаў "Чырвонага дома". Скажыце, што гэты шэранькі чыноўнік можа добрага зрабіць для народа, для краіны? Нічога.

Заўважаю: да ўлады прыбіваецца ўсё больш і больш шэрых людзей. І гэта невыпадкова: шэрыя чыноўнікі не могуць пагадзіцца з тым, каб побач знаходзіліся разумныя, з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй людзі. У выніку церпіць справа, інтарэсы дзяржавы. Але ці ж хвалюе гэта шэранькіх? Для іх галоўнае – набіць жывот і кішэні, як мага больш пацягнуць, а пасля іх – хоць патоп.

Я вось сяджу і думаю: што сумленным людзям трэба зрабіць, каб сітуацыя змянілася да лепшага? Першае – не маўчаць, заняць прынцыповую пазіцыю. Другое – аб'яднацца і, як кажуць, даць бой шэрасці, розным прыстасаванцам. Трэцяе – падчас любых палітычных кампаній выкарыстаць усе магчымасці, каб як мага да больш шырокай грамадскасці давесці інфармацыю пра тое, што ў нашай краіне творыцца. Калі б людзі ведалі хоць дзесятую частку праўды, я ўпэўнены, што яны па-іншаму паставіліся б да многіх праблем.

Што ні кажыце, а з засіллем шэрасці трэба змагацца. Інакш загінем усе.

Сяргей КАЗУБОЎСКІ,
беларус,
якога хвалюе
лёс Бацькаўшчыны.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Шыгалаў праходзіць абследаванне ў Англіі

У мінулую нядзелю старшыня савета дырэктараў Гандлёвага цэнтра "Ждановічы" Яўген Шыгалаў, які знаходзіцца пад следствам, у суправаджэнні сына і зяця вылецеў у Лондан.

Як неаднаразова пісала "Народная воля", у свой час Шыгалаў перанёс два інфаркты і аперацыю на сэрцы. Зараз, магчыма, спатрэбіцца яшчэ адно хірургічнае ўмяшальніцтва, якое могуць выканаць толькі англійскія кардыяхірургі, у распараджэнні якіх ёсць сучаснае абсталяванне.

Напрыканцы чэрвеня бізнесмену Шыгалаву, якога затрымалі 5 красавіка і ўтрымлівалі пад вартай, была зменена мера ўстрымання. Яго вызвалілі пад заклад у 10 мільярдаў рублёў (4 мільёны 740 тысяч долараў). Апошнім часам пагоршыўся стан здароўя Шыгалава, ён знаходзіўся на лячэнні ў РНПЦ "Кардыялогія", і абарона Шыгалава неаднаразова хадайнічала аб яго вызваленні з-пад варты.

"Грошы збіралі ўсім светам, – расказалі родныя Шыгалава. – Некаторую суму бралі ў доўг, прыйшлося закласці ўласную маёмасць, маёмасць прадпрыемства. Сёння для нас галоўнае – здароўе Яўгена Аляксандравіча".

Амаль адразу пасля вызвалення Шыгалаў вылецеў у Лондан, у кардыяхірургічную клініку на абследаванне. Адмысловы дазвол на выезд дало следства, у Лондане беларускі бізнесмен можа знаходзіцца два тыдні.

– Калі лячэнне зацягнецца, – кажуць родныя бізнесмена, – мы павінны будзем пісьмова паведаміць следства. Колькі часу Яўген Аляксандравіч правядзе ў шпіталі, сказаць цяжка. Адчувае ён сябе не самым лепшым чынам, пералёт перанёс кепска. Сын Сяргей застанецца з ім на ўвесь час абследавання і лячэння.

Родные бізнесмена абвяргаюць і апошнія чуткі, якія блукаюць па Мінску, што быццам бы магчымасць апынуцца па-за кратамі каштавала Шыгалаву 51 працэнт акцый, якія ён аддаў дзяржаве. "Гэта хлусня", – кажуць родныя.

Нагадаем, што гендырэктару ГЦ "Ждановічы" прад'яўлена абвінавачванне па ч.3 артыкула 424 "Злоўжыванне ўладаю ці службовымі паўнамоцтвамі". Сваёй віны Яўген Шыгалаў не прызнае.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Калі Аляксандр Мілінкевіч не пойдзе ў дэпутаты, ён дапусціць чарговую памылку

Прачытаў, што Аляксандр Мілінкевіч прыняў рашэнне не балатавацца падчас восеньскіх парламенцкіх выбараў. І, лічу, дапусціў чарговую памылку. Аўтар заметкі, надрукаванай у "Народнай волі", мае рацыю: калі б спадар Мілінкевіч стаў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, то адной нагой ён ужо стаяў бы на парозе прэзідэнцкага кабінета. І я ўпэўнены, што калі б усе яго прыхільнікі падставілі плячо, узялі пад кругласутачны кантроль кожны выбарчы ўчастак, то ніхто не змог бы сфальсіфікаваць вынікі галасавання - і Аляксандр Мілінкевіч атрымаў бы дэпутацкі мандат.

А так улады скажуць: спалохаўся. І пасеюць у пэўнай часткі электарату недавер да яго, як да палітычнай асобы. У любым выпадку Аляксандр сам сабе падразае крылы. А, можа, іх у яго наогул няма?

Андрэй КУНІЦКІ,
выбаршчык.

ПАЗІЦЫЯ

Хіба наша мова такая, што ў «сур'ёзных» выпадках ёю нельга карыстацца?

Пачну з характэрнага прыкладу – аднаго з мноства падобных, што сустракаюцца на кожным кроку і абураюць мяне як грамадзяніна Беларусі. Калі ласка, вось вытрымка з апублікаванага тэксту дамовы паміж міністэрствамі адукацыі Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі на 2006--2010 гады: "Совершено в г.Пекине 5 декабря 2005 года в двух экземплярах, каждый на белорусском, русском и китайском языках, причем все тексты имеют одинаковую силу. В случае возникновения разногласий при толковании положений настоящего Соглашения предпочтение отдается тексту на русском языке". Відаць, нашым чыноўнікам, якія сачынялі дакумент, было вельмі сорамна на міжнародным арэне за "недаразвітую" беларускую мову...

І праз 12 гадоў пасля рэферэндуму 14 мая 1995 года, якім рускай мове надаваўся статус дзяржаўнай нароўні з беларускай, насамрэч ніякай такой роўнасці і знаку няма. Міжволі задаешся пытаннем: чаму беларускі дзяржаўны службоўца аддае няўхільна, не зважаючы на абвешчаную "роўнасць", перавагу рускамоўнаму дакументу перад беларускамоўным?

За гады існавання незалежнай Беларусі, вельмі мала (калі не сказаць - нічога) зроблена для забеспячэння раўнапраўнага выкарыстання беларускай і рускай моў у розных галінах народнай гаспадаркі, працы дзяржаўных і недзяржаўных устаноў. Многія спецыялісты нават сцвярджаюць, што беларуская мова нібыта не дазваляе забяспечыць іх прафесійную дзейнасць. Гэта тэндэнцыя праяўляецца і ў міжнароднай дзейнасці беларускіх дзяржаўных устаноў, іншых юрыдычных і фізічных асоб.

Пра тое, што ў краіне забеспячэнне ўсебаковага развіцця і функцыянавання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця фактычна на нулі, мне аргументавана давялі да ведама супрацоўнікі беларускага "Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва" – у адказ на маё імкненне дамагчыся выкарыстання беларускай мовы ў сістэме персаніфікаванага ўліку ў адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Тагачасныя кіраўнікі Фонду (то былі 2002--2003 гады) пераконвалі, што для такой сістэмы найбольш падыходзіць СУБД Oracle'81, рускамоўную версію якой Фонду за грошы беларускага падаткаплацельшчыка павінна паставіць СП "Micro Express Int'l". Пры гэтым звярталі ўвагу, што "даработка Oracle с целью поддержки белорусского языка может быть выполнена только самой корпорацией Oracle (США) на основании соответствующего обращения правительства Республики Беларусь". Я зразумеў празрысты намёк, але звяртацца ва ўрад не стаў. Таму што адтуль хутчэй за ўсё грамадзянін можа атрымаць адказ кшталту: "Ваш зварот накіраваны для разгляду ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь" і г.д. Ліст дойдзе зноў да Фонду, які з'яўляецца структурным падраздзяленнем міністэрства...

Разумны дзяржаўны чалавек з таго Фонду чамусьці не распавёў мне і грамадзянам Беларусі, з якой прычыны пры разгрэдзе "тэндэрных" прапаноў Фонд працаваў з правальнымі заяўкамі "ГП "НИИЭВМ", НДО "Кибернетика" і заведама выйгрышнай заяўкай СП "Micro Express Int'l", а прапанову карпарацыі Oracle запрошваць не стаў? Дакументы, што даслаў мне Фонд, паказваюць: іншым дзяржавам (Казахстан, Літва, Латвія, Расія, Украіна, Польшча і іншыя) было танней закупіць прадукцыю не ў фірмы-пасрэдніка, а непасрэдна ў вытворцы – карпарацыі Oracle. Дарэчы, Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь на пасяджэнні ад 4.12.2003 г. сітуацыю з карткамі персаніфікаванага ўліку канстатаваў як адзін з прыкладаў пераважнага выкарыстання ў Беларусі рускай мовы і прапанаваў (як зразумеў аўтар з тэксту рашэння Высокага суда ад 4.12.2003 г., №П-91/2003) заканадаўцам "разгледзець пытанне аб унясенні ў Закон "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і іншыя акты заканадаўства змен і дапаўненняў, здольных забяспечыць фактычную роўнасць дзяржаўных моў".

Пасля такога рашэння Канстытуцыйнага суда была ўпэўненасць, што звяртацца ва ўрад мне не спатрэбіцца, таму што "рашэнне Канстытуцыйнага суда падлягае выкананню неадкладна пасля апублікавання", "уступае ў сілу з дня яго абвяшчэння", а "невыкананне, неналежнае выкананне альбо перашкоды выкананню рашэння Канстытуцыйнага суда цягне адказнасць, устаноўленую законамі і Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.07.1999 г. №29". Але ў 2008 годзе ў адчыненых для звычайных грамадзян крыніцах я не змог знайсці і намёку на выкананне гэтай пастановы Канстытуцыйнага суда.

А цяпер, на фоне абсалютнага панавання ў беларускім грамадстве рускай мовы, разгледзім вельмі павучальны прыклад назвы нашай дзяржавы "БЕЛАРУСЬ", запісанай у адназначным напісанні і гучанні беларускамоўным і рускамоўным тэксце нашай Канстытуцыі. Аднак гэты заканадаўча зацверджаны тэрмін "Беларусь" на абшарах суседняй дзяржавы – Расіі выкарыстоўваўся толькі да 17.08.1995 г., бо з гэтага дня пачало дзейнічаць распараджэнне тагачаснага высокапастаўленага чыноўніка Адміністрацыі прэзідэнта Расійскай Федэрацыі С.Красаўчанкі №1495 аб напісанні назваў 14 дзяржаў – былых рэспублік СССР і іх сталіц. Паралельна ў Расійскай Федэрацыі была праведзена адпаведная тэрміналагічная праца, у выніку якой інстытут "ВНИИКИ" Дзяржстандарту Расіі і аб'яднанне "ИнформВЭС" Міністэрства замежных эканамічных сувязяў Расіі распрацавалі Агульнарасійскі класіфікатар краін свету ("ОКСМ"), які быў уведзены ў дзеянне пастановай Дзяржстандарту Расіі ад 27.12.1995 года №641. У выніку для рускамоўнай прасторы была ўзаконена назва нашай дзяржавы "БЕЛОРУССИЯ"...

Здавалася б, якое дачыненне маюць расійскія законы да нашай моўнай практыкі? Ды вось не мною толькі заўважана: цяпер у вуснах беларускіх выступоўцаў усё часцей і часцей чуецца "Белоруссия". Так суседняя краіна, яшчэ да аб'яднання з нашай, перайначвае нашы законы, не зважаючы на ўрон гонару грамадзян Рэспублікі Беларусь. Але ж мы і самі "харошыя"...

Сказанае вышэй можна аднесці да амаль спрэс рускамоўнай тэрміналагічнай прасторы Беларусі, у тым ліку ў розных галінах навукі і тэхнікі. Пры гэтым многія навукоўцы спасылаюцца на нібыта "недаразвитость белорусского языка", а намеснік старшыні прэзідыума НАНБ А.І.Лесніковіч на мой запыт адказаў так: "Статус рускамоўных тэрмінаў вызначаецца ў тэрміналагічных установах Расійскай Федэрацыі. На жаль, дапамагчы вам у гэтай справе ў нас няма магчымасці". Чамусьці такая магчымасць была яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя, калі за кароткі час беларусізацыі ў БССР праблема стварэння ўласнай навукова-тэхнічнай тэрміналогіі паспяхова вырашалася.

Сёння трэба брацца за справу закасаўшы рукавы. Каардынацыю работ па стандартызацыі тэрміналагічнай дзейнасці для галін народнай гаспадаркі Беларусі заканадаўствам даручана праводзіць Дзяржстандарту. Тэрміны і азначэнні для тэхнічных нарматыўных прававых актаў (ТНПА) распрацоўваюць асобныя падраздзяленні галіновых міністэрстваў. Але ў выніку такой працы адзін-тры тэрміны на беларускай мове, як правіла, могуць з'явіцца толькі на першай старонцы ТНПА, далейшы тэкст дакумента ствараецца зноў-такі выключна на рускай мове – за грошы беларускіх падаткаплацельшчыкаў і ў парушэнне Канстытуцыі Беларусі, Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і іншых актаў заканадаўства.

Многія чыноўнікі галіновых ведамстваў не выконваюць патрабаванні беларускіх заканадаўчых актаў аб мовах, пад якімі пастаўлены подпіс прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі.

У колішняга старшыні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь, а зараз генеральнага пракурора Г.А.Васілевіча, які добра ведае і наша моўнае заканадаўства, цяпер, падобна, з'явіліся рычагі, якія дазваляюць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам прыняць меры па забеспячэнні аднолькавых умоў функцыянавання ў сістэме Дзяржстандарту Беларусі – і, адпаведна, у розных галінах народнай гаспадаркі дзвюх дзяржаўных моў. Ад гэтага будзе толькі вялікая карысць нам усім. Колькі ж мірыцца з тым, што наша высокаразвітая, багатая мова кімсьці лічыцца непрыдатнай у "сур'ёзных" выпадках?

Яўген МАЙСЕЙЧЫК
кандыдат тэхнічных навук.

Што гэта за дзяржава?

Спрэс толькі і чуеш: Саюзная дзяржава, Саюзная дзяржава... А што гэта такое? Калі, як абвяшчаюць нашы ўлады, гэта справа будучага (я пакідаю тут за дужкамі жыццёва важнае і хвалюючае пытанне нашай незалежнасці), то як зараз, без юрыдычнага афармлення такой дзяржавы, могуць функцыянаваць нейкія "Госсовет", "Постоянный комитет", "Совет министров", "Парламентское собрание" і г.д.?

Мы, простыя людзі, так і не ведаем, якое ж дзяржаўнае ўтварэнне цягам больш за дзесятак год ствараецца: імперыя, федэрацыя, канфедэрацыя? Вось бы замест агульных слоў пра "любоў, дружбу і адзінства" нашы кіраўнікі гэта патлумачылі...

З павагай -
Тамара БЕЛАЯ,
мінчанка.

Ніякай "Лініі Сталіна" ля Заслаўя і ў паміне не было

Паглядзеў па БТ рэпартаж пра імправізаваны спектакль пад Заслаўем, на так званай "Лініі Сталіна". Суцэльная прапаганда! Добра, што журналісты ўзялі інтэрв'ю ў ветэрана Айчыннай вайны, які добра памятае ўсе падзеі тых часоў. Дык вось, ён сам сказаў, што ніякай "Лініі Сталіна" пры наступе немцаў тут не было, для абароны ў нашых салдат налічвалася пара дзотаў, астатнія былі выведзены з баявога стану задоўга да вайны.

Зноў дзеля прапагандысцкіх мэт займаемся хлуснёй? А на хлусні далёка не паедзеш. Разумныя людзі не пагодзяцца марнаваць час на нейкую міфічную "Лінію Сталіна". Шкада, што дарэмна ўбухана столькі народных грошай...

Карп ІВАНЦОЎ,
мінчанін.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 ЛІПЕНЯ 2008 г.

Віва, Куба!

Здаецца, што дыктатура не рухне ніколі.
Але гісторыя таму і працягваецца, што ні адна дыктатура не была вечнай і рана ці позна ёй прыходзіць канец.
Як гэта адбываецца, журналістка Віталіна Грахоўская на свае вочы пабачыла на Кубе.

(Заканчэнне. Пачатак у №№97–98.)

Кубінская турма

Оскар Марыё адсядзеў у турме паўтара года за публікацыі на сайце www.cubanet.org. Прычым асуджаны ён так і не быў, а толькі затрыманы. Трэцюю частку тэрміну ён прабыў у "абязьянніку", у якім звычайна ніхто не затрымліваецца больш за 2—3 дні. Туды нельга праносіць нічога: ні вопраткі, ні мыла, ні кніг. У падвале, дзе няма ні святла, ні вокнаў, ніколі не ведаеш: дзень на дварэ ці ноч, Оскару Марыё давялося прабыць паўгода.

Спаць даводзілася на падлозе, дзе бегалі пацукі з прусакамі. Коўдру выдавалі з 22 гадзін да 5 раніцы.

Пасля яго цягалі па розных турмах. Пэўны час, напрыклад, Оскар Марыё быў у камеры на 80 чалавек. Аднак там было больш за 100 асуджаных. Ложкаў, вядома, хапала не на ўсіх.

Сустракацца з сям'ёй можна было раз на тыдзень па 10—15 хвілін. І пра ўмовы ўтрымання не дазвалялася расказваць. Кіраўніцтва турмы часта рабіла наступнае: Оскару Марыё казала, што спатканне ў панядзелак, а жонцы — што ў сераду. Вядома ж, спаткання не адбывалася. Для яго гэта была пакута — жонка не прыйшла. А яна думала, што не прыйшоў ён.

Суд на Оскарам Марыё так і не адбыўся. Яго адпусцілі. Аднак здароўе журналіст сапсаваў канчаткова. Ён зарабіў сабе дыябет, алергію, гіпертанію, з'явіліся праблемы з ныркамі і страўнікам.

"Цяпер я больш асцярожны, — кажа Оскар Марыё. — Калі тады я вытрымаў у турме паўтара года, цяпер не вытрымаю і дзесяці дзён".

У 1958 годзе на Кубе было 10—12 турмаў і каля 12 тысяч вязняў. Сёння па ўсім востраве больш за 200 турмаў і мільёны зняволеных. Між іншым, самы доўгі ў свеце тэрмін па палітычных матывах атрымаў кубінец — 30 год.

Калі Оскар Марыё даведаўся, што я з Беларусі, адразу ж стаў размаўляць са мной па-руску. Аказалася, што ён вучыўся ў політэхнічным універсітэце ў Краснадары. У дыпломе Оскара Марыё толькі адно "выдатна" — за марксісцка-ленінскае вучэнне.

Ён і праўда верыў у рэвалюцыю, расказвае журналіст. Але зараз ён ведае нашмат больш. Ён пажыў у трох краінах, і ведае, што значыць кубінскі сацыялізм.

Оскар Марыё: "Я думаў, што камунізм — гэта нічога, нядрэнна. А потым пабачыў, што камунізм — гэта дыктатура. Зараз працую як незалежны журналіст. Я быў у турме год і чатыры месяцы. Проста дыктатура Фідэля не дазваляе, каб мы працавалі".

"Я не надта рэлігійны чалавек, — кажа Оскар Марыё. — Але часам мне здаецца, што на Кубе ляжыць праклён".

Ягоная дачка Алена (ад першай жонкі з Расіі) цяпер жыве ў Швецыі. Займае там высокую пасаду. Яе сыну і яго ўнуку 15 год. Ён вучыцца ў школе для таленавітых. Не так даўно яны прыязджалі да дзядулі на Кубу. Оскар Марыё таксама быў у іх у Швецыі ў 1998 годзе. Тады ён яшчэ не быў такім вядомым журналістам. У 2004 годзе ён атрымаў Шэнгенскую візу, купіў падарункі дачцэ і ўнуку, але за тыдзень да паездкі ў Швецыю ўлады анулявалі выдадзеную візу.

Пры нас на маленькім шматку паперкі Оскар Марыё напісаў запіску сваёй дачцэ і перадаў Сары. Там было толькі прывітанне і словы пра тое, што мы яму спадабаліся.

Дух рэвалюцыі і пах сацыялізму

Рэвалюцыя для Кубы — гэта ўсё. Сацыялізм для Кубы — яшчэ больш. Словамі "Сацыялізм ці смерць" сустрэў нас у аэрапорце горад Альгін. Паўсюль — рэвалюцыйныя, агітацыйныя плакаты і надпісы. Нават у самых маленькіх вёсачках ці ўздоўж самых разбітых дарог можа не быць указальніка, што гэта за населены пункт, але абавязкова будзе альбо партрэт Чэ Гевары, альбо Фідэля Кастра, альбо проста надпісы крэйдай на асфальце "Viva Fidel! Viva Raul!"

Сустрэўшы адзін раз надпіс "Шчаслівай дарогі", мы спачатку здзівіліся і нават не зусім зразумелі: "Што? Гэта не прапагандысцкі надпіс?.."

У 1960 годзе на Кубе быў створаны Камітэт па абароне рэвалюцыі (CDR), каб абараняць ідэі рэвалюцыі ад унутраных ворагаў. Сёння аддзелы CDR знаходзяцца на кожнай вуліцы, на кожным блоку ў кожным горадзе і нават невялікіх вёсках. У адной толькі Гаване больш за 15 тысяч камітэтаў. Па ўсёй Кубе іх больш за 100 тысяч. Каля 70 працэнтаў насельніцтва з'яўляюцца членамі CDR.

З аднаго боку, CDR — гэта штосьці накшталт нашых прафсаюзаў. Яны збіраюць кроў для бальніц, адпраўляюць людзей у адпачынкі, арганізоўваюць культурныя імпрэзы. Аднак асноўная іх праца — гэта збор інфармацыі пра кожнага жыхара з пэўнай зоны. Члены CDR сочаць за людзьмі і перадаюць усю інфармацыю ў вышэйшую інстанцыю — Міністэрства ўнутраных спраў. Нярэдка пад шыльдамі CDR можна заўважыць людзей, якія спакойна сядзяць на крэслах і, здаецца, нічога не робяць. Насамрэч яны сочаць. Такая праца.

На першы погляд можна падумаць, што кубінцы і праўда шалеюць ад ідэй рэвалюцыі і сённяшняй улады. Аднак больш блізкае знаёмства з некаторымі жыхарамі вострава Свабоды паказвае — людзі шмат чым незадаволены. Але занятыя паўсядзённымі праблемамі ды пытаннямі, як пражыць наступны дзень, што з'есці самім ды як накарміць дзяцей, яны забываюцца на змаганне.

У Альгіне з аэрапорта да знятай кватэры нас падвёз кубінскі таксіст па мянушцы Кітаец (з-за кітайскіх каранёў) на старых "Жыгулях". Наступнай раніцай мы пабачылі яго пад дзвярыма кватэры. Ён чакаў, каб падвезці нас у цэнтральны парк, да якога было літаральна два блокі.

— Усяго за 2 песа, — кленчыць ён.

— Не, дзякуй. Мы пройдземся, паглядзім горад, — не паддаемся мы.

Але ўрэшце здаліся. Разгаварыліся. Аказалася, ён толькі 2 месяцы як кінуў працу настаўніка па гітары — прафесія не прыносіла грошай. Ён зарабляў 440 кубінскіх песа. Дастаў свой старэнькі аўтамабіль і стаў вазіць турыстаў.

У 1996 годзе ягоны брат збег у Амерыку на ўласнаручна зробленай лодцы. Працуе там на будоўлі. Штомесяц дасылае грошы сваім семярым братам на Кубе.

Мы сустрэліся з гэтым таксістам яшчэ раз праз некалькі дзён, калі вярнуліся ў Альгін са свайго падарожжа. І дамовіліся, каб ён адвёз нас у аэрапорт. Па дарозе туды ён завёў размову пра апазіцыю. Паскардзіўся, што мала кубінцаў ведае пра яе. Аднак ён усё адно спадзяецца, што дэмакратычныя змены прыйдуць на востраў Свабоды.

У аэрапорце мы сустрэлі яшчэ аднаго кубінца, які кінуў сваю асноўную працу па спецыяльнасці дзеля большых грошай. Гэта бармен. Ён выдатна размаўляе па-англійску. Высветлілася, раней быў настаўнікам англійскай мовы. Цяпер працуе барменам па 15 гадзін у суткі. Скардзіцца, што цяжка, аднак грошы патрэбны.

Прыватны бізнес і дзяржаўная ўласнасць

Мы стаім побач з Капітоліем. Ловім таксі, якое завезла б нас на ўскраіну Гаваны. Стаім доўга, а машыны ўсё не спыняюцца.

— Яны маюць свае маршруты, — тлумачыць нам Адалін. Таму і даводзіцца пальцам паказваць кірунак, куды мы хочам заехаць. А таксісты ў сваю чаргу паказваюць, куды едуць яны. Гаворка ідзе толькі пра прыватныя таксі альбо проста нелегальныя.

— Глупства, — гаворыць Адалін, — мець сваю ўласную машыну і не падвозіць нікога па дарозе.

Прыватнікам забараняецца падвозіць турыстаў. Аднак кубінцы ўсё адно рызыкуюць. Мы ўпяцёх забіліся ў старую амерыканскую машыну. Наперадзе разам з кіроўцам — трое, плячо да пляча. Нас спыніў паліцэйскі. Выратавала таксіста толькі тое, што ён — былы агент. Высветлілася, машыну ён калісьці атрымаў ад Фідэля ў падарунак. Аднак цяпер, у адстаўцы, ён не можа пражыць на пенсію, таму і падвозіць людзей.

Яшчэ адна цікавая гутарка адбылася на наступны дзень з іншым таксістам. Ён з Фернарысам паспрачаўся наконт прыватнай уласнасці. Фернарыс сцвярджаў, што прыватная ўласнасць — рухавік прагрэсу. А таксіст, хоць і перажываў, што не можа, напрыклад, купіць уласную кватэру, усё ж заступаўся за дзяржаўную маёмасць. Урэшце Фернарыс не вытрымаў і сказаў: "Ды твая машына пасля 50 гадоў усё яшчэ ездзіць толькі таму, што яна твая ўласная!"

У 1993 годзе, калі дапамога Савецкага Саюза ўжо 2 гады не паступала на Кубу, улада адчула, што эканоміцы могуць прыйсці "кранты", і дазволіла кубінцам мець прыватны бізнес. Так, мастакі змаглі працаваць на сябе. Стала магчымым здаваць кватэры, мець уласныя кавярні і рэстараны — paladar (у якіх, аднак, нельга ставіць больш за 6 столікаў). З'явіліся прыватныя цырульні і майстэрні запальнічак.

Праз некалькі гадоў усе ліцэнзіі на прыватны бізнес замарозілі. Хто паспеў яго стварыць, дагэтуль жыве за кошт свайго бізнесу. Новых не з'яўляецца. Кубінская эканоміка сёння ў асноўным трымаецца за кошт турыстаў.

Дагэтуль па ўсёй Гаване за маленькімі столікамі сядзяць дзядзькі ды рамантуюць і напаўняюць бензінам аднаразовыя запальнічкі.

Дагэтуль бачная розніца. У дзяржаўным рэстаране і прыватным зусім розныя адносіны да кліента. У звычайным турыстычным рэстаране я атруцілася двойчы (бярыце з сабою таблеткі, калі збіраецеся на Кубу). Вада там брудная, аднак калі нават піць толькі ваду ў бутэльках, ежу ўсё адно гатуюць у бруднай. Часта ў рэстаранах няма ні вады, ні кетчупу, ні яшчэ нейкіх банальных рэчаў.

Кубінскія бібліятэкі і жыццё ў правінцыі

— Гэта мая бібліятэка, — паказвае на дзве паліцы з кнігамі Аімі.

Калі мы прыйшлі да журналісткі, на дзвярах нас сустрэла цыдулка наступнага зместу: "Выбачайце, мяне няма дома. Я пайшла на вуліцу". Аднак, пачуўшы нашы галасы, Аімі ўсё ж адчыніла дзверы. Выявілася, што, жывучы ў цэнтры Гаваны, ёй пастаянна надакучаюць прадаўцы, што ходзяць па кватэрах ды прадаюць розныя рэчы. Таму жанчына і павесіла цыдулку.

Да Аімі прыходзяць знаёмыя, каб пачытаць кніжкі з яе бібліятэкі. У звычайных дзяржаўных бібліятэках цяжка знайсці літаратуру непрапагандысцкага зместу. А нават калі і знойдзеце, то давядзецца адказаць на такую колькасць пытанняў, што лепш ужо і без кнігі абысціся, гаворыць Аімі.

У Эльесэра з горада Анціла — былога трэнера па баскетболе — таксама свая незалежная бібліятэка. Кніжак у ёй значна больш, чым у Аімі — цэлая шафа. Некалькі год таму іх было яшчэ больш. Ды ўлады канфіскавалі абсалютна ўсе кнігі — нават дзіцячую літаратуру. Сёння Эльесэр з паплечнікамі назбіраў новую калекцыю. Сярод кніг — дзіцячая, навуковая літаратура, раманы, творы чэшскіх, польскіх, украінскіх аўтараў — еўрапейскі досвед змагання за дэмакратыю.

Крысціян паказвае мне кнігу Вацлава Гавала. Гаворыць:

— Гэтая кніга для нас, як Біблія. Па ёй мы вучымся, як перамагчы рэжым.

Грамадскім дзеячам з правінцыі ўвогуле даводзіцца цяжка. Дыктатура там нашмат больш жорсткая, чым у Гаване. Часта здараюцца так званыя actos de repudio — збіццё актывістаў.

Насупраць бібліятэкі Эльесэра і яго дома па сумяшчальніцтве — офіс Камітэта па абароне рэвалюцыі. Таму назіранне за журналістам кругласутачнае. Праз некалькі хвілін, як мы зайшлі да Эльесэра, у кватэру пастукала жанчына з Камітэта — папрасіла цукру.

Для таго, каб скарыстацца інтэрнетам, даводзіцца ехаць у Гавану. Дарога на аўтобусе па разбітых кубінскіх дарогах займае каля тыдня. Эльесэр скардзіцца, што гэты час ён можа патраціць толькі на тое, каб спраўдзіць сваю паштовую скрыню на yahoo, бо калі не карыстацца ёю тры месяцы, яна блакуецца.

Ёсць у правінцыйных журналістаў і мабільныя, купленыя, аднак, на чужыя імёны. Але размаўляць па іх не даводзіцца — дорага. Таму журналісты "маякуюць" адно аднаму, а потым ідуць тэлефанаваць з аўтаматаў.

— У Анціле больш за 40 апазіцыйных актывістаў, — з гонарам гаворыць Эльесэр. І на Кубе такой колькасцю можна ганарыцца — у горадзе пражывае ўсяго 12 тысяч жыхароў.

Кубінскія геі і іспанская мова

Сітуацыя з геямі на Кубе апошнім часам мяняецца. Дзяржава спрабуе ўключыць гомасексуалістаў у грамадства. Дачка Рауля Кастра стварыла незалежны інстытут па абароне правоў геяў. Распрацоўваецца праект закона, які дазволіў бы аперацыі па зменне полу. Яшчэ ў 80-х гадах на Кубе рабілася процьма нелегальных аперацый.

Аднак наш знаёмы гей Лукас Гарвэ ўсё адно незадаволены сітуацыяй. Ён лічыць, што гэта ўсяго толькі прапаганда, каб паказаць, што ўлады паважаюць правы геяў. На самай жа справе большая частка грамадства застаецца гомафобамі.

— Яшчэ адна праблема, — гаворыць Лукас Гарвэ, — улада сканцэнтравалася на праблемах СНІДу і праблемах геяў. Мімаволі людзі пачынаюць асацыяваць дзве гэтыя рэчы. Зараз на Кубе папулярны дыскусіі на тэлебачанні на тэму гомасексуалістаў. Аднак там паказваюць толькі геяў з праблемамі.

— А мы ж нармальныя людзі! — ускрыквае Лукас Гарвэ. — Сярод нас ёсць і настаўнікі, і мастакі, і паэты. Дый шмат людзей з высокімі дзяржаўнымі пасадамі таксама геі. Але ў іх тэлебачанне геяў не бачыць — гульня такая.

Сам Лукас Гарвэ — філолаг па адукацыі. Ён напісаў кнігу пра тое, як змянялася кубінская іспанская мова апошнія дзесяцігоддзі. У 1961 годзе на Кубе адбылася моўная рэформа. З'явілася новая палітычная лексіка, каб абазначыць новыя рэаліі, такія як "міліцыя". Аднак яна (рэформа) у рэальнасці падзяліла слаі насельніцтва. Журналістаў, пісьменнікаў, мастакоў сталі называць ваярамі культуры. Незалежных журналістаў — актывістамі за правы чалавека, што на дзіва набыло там негатыўнае адценне.

63% насельніцтва Кубы маладзейшае за 40 год. І яны не ведаюць ані іншай сістэмы, ані іншай мовы. Правільна гаворыць Лукас Гарвэ — змяніць мову — гэта шлях змяніць менталітэт грамадства.

Талоны на прадукты і чорны рынак

Амарыліс і Фернарыс запрасілі нас да сябе ў госці. Жывуць яны на самым ўскрайку Гаваны, таму ехаць давялося перакладнымі ад звычайнага таксі і камфартабельнага аўтобуса да перароблена пад грамадскі транспарт грузавіка з выразанымі дзіркамі замест вокнаў.

Пакуль Амарыліс гатавала рыс з бабамі, Фернарыс кудысьці збегаў і прынёс курынага мяса.

— Гэта з чорнага рынку, — тлумачыць ён.

Ужо 46 год на Кубе дзейнічае сістэма талонаў на прадукты і не толькі. Да прыкладу, у месяц па талонах дазваляецца купіць 3 кг рысу на чалавека — па 50 санціма́ў за кілаграм. Усё, што звыш талоннай нормы, — ад 3,5 і больш песа за кілаграм.

— Для вас, еўрапейцаў, 3 кг рысу на месяц, можа, і замнога, — гаворыць Амарыліс. — Але ж мы акрамя яго амаль нічога не ямо.

Яшчэ па талонах можна купіць паўкіло курыцы ў месяц, каля 300 грамаў бабоў, 2 кг цукру. У спісе ёсць і паўкілаграма рыбы. Але яе звычайна не бывае (каб людзі не ўцяклі, лодку купіць амаль немагчыма, вось і рыбы на востраве няшмат), таму рыбу замяняюць зноў жа курыцай. Можна яшчэ набыць каля 100 грамаў кавы, 250 мілілітраў алею, штосьці падобнае да масла, памідоры, вяндліну.

Па талонах на Кубе купляюць не толькі прадукты. Гэта таксама адзін цюбік зубной пасты на сям'ю. Калі членаў сям'і больш за 4 чалавекі (не важна — 5 ці 15), яны могуць купіць толькі 2 цюбікі пасты па талонах. На чорным рынку яна каштуе па 10 песа за цюбік.

У талонных спісах таксама 2 маленькія кавалачкі мыла на сям'ю. Адзін — для цела, другі — для мыцця бялізны. Але, па словах Амарыліс, мыла такое смярдзючае, што карыстацца ім проста немагчыма.

Тое, што можна купіць па талонах, заканчваецца за тыдзень. Астатнюю частку месяца даводзіцца жыць за кошт чорнага рынку. А ён на Кубе проста квітнее. І купіць там можна ўсё.

Афіцыйна на Кубе 4% беспрацоўных. Аднак першае, што мне кінулася ў вочы, калі я патрапіла на востраў Свабоды, гэта натоўпы кубінцаў на вуліцах, якія гуляюць у даміно, дыскутуюць у кампаніях і проста нічога не робяць. Як аказалася, сапраўды на Кубе большая частка насельніцтва не працуе. Усё, за кошт чаго жывуць кубінцы, — гэта тое, што яны крадуць і прадаюць.

Напрыклад, з-за таго, што на Кубе нельга забіваць кароў, ялавічыну ў звычайных крамах проста не знайсці. Затое на чорным рынку можна купіць нават яе — прыкладна за 10 канвертуемых песа за кілаграм. Усё там — скрадзенае ў дзяржавы.

Таму, калі людзі і шукаюць працу, то тую, дзе можна штосьці скрасці. А крадуць і прадаюць на Кубе ўсё — нават адказы на экзаменацыйныя пытанні ва універсітэтах. Калі няма грошай, за паслугі расплачваюцца ежай.

Вядома ж, чорны рынак хоць і чорны, але пра яго ведаюць усе. І дзяржава заплюшчвае на гэта вочы. А афіцыйныя беспрацоўныя там называюцца "даступнымі для працаўладкавання".

Пра дармавую сацыяльную падтрымку ў такім эканамічным хаосе казаць не даводзіцца. У спецыяльных крамах можна купіць таннае і якаснае малако для дзяцей да 3-х год. Дзецям да сямі год — малако ўжо горшай якасці.

Востраў Свабоды нагадала мне вялікі хаос, нібы з фільма пра краіну пасля Апакаліпсісу. І жыццё ў ёй будзе цягнуцца да таго часу, пакуль у краіне будзе што красці.

Віталіна ГРАХОЎСКАЯ.
(Еўрапейскае радыё для Беларусі).

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 ЛІПЕНЯ 2008 г.

РЭГІЁН

Першыя аперацыі на адкрытым сэрцы праведзены ў Брэсцкай абласной бальніцы

Тры аперацыі па аортакаранарным шунціраванні прайшлі 30 чэрвеня, дзве – 1 ліпеня, дзве – 2 ліпеня.

Як паведаміў БелаПАН галоўны ўрач абласной бальніцы Аляксандр Карпіцкі, усе аперацыі выконваюцца спецыялістамі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра кардыялогіі, якім асісціруюць кардыяхірургі абласной бальніцы.

"Асваенне такіх аперацый – гэта яшчэ адзін этап у працы па стварэнні рэгіянальнага кардыяхірургічнага аддзялення, якое плануецца адкрыць да канца года, – зазначыў А.Карпіцкі. – Для гэтага ў абласной бальніцы ёсць неабходная матэрыяльна-тэхнічная база, рыхтуюцца спецыялісты па кардыяхірургіі. Апрача таго, на базе створанага ў бальніцы эндаваскулярнага аддзялення на працягу двух гадоў паспяхова праводзіцца стэнтаванне каранарных артэрый і іх ангіяпластыка, а таксама пастаноўка пастаянных кардыястымулятараў".

Паводле слоў А.Карпіцкага, адкрыццё рэгіянальнага кардыяхірургічнага аддзялення дазволіць значна скараціць тэрміны чакання аперацый хворымі.

Дарэчы, у Брэсцкай вобласці ў аперацыях на сэрцы маюць патрэбу больш як 2 тыс. чалавек.

Ларыса ШЫГАНАВА.

СЛЫШАЛИ?

«Детектор лжи» узаконили

Министр внутренних дел Беларуси Владимир Наумов утвердил инструкцию о порядке проведения опроса граждан с использованием полиграфа (в народе этот прибор называют "детектором лжи").

Как написано в инструкции, в ходе опроса должен использоваться полиграф, "не наносящий ущерба жизни и здоровью человека, а также окружающей среде".

Опрос с использованием полиграфа может использоваться в двух случаях – в рамках проведения оперативно-розыскных мероприятий, а также при проведении отбора на службу в органы внутренних дел.

В инструкции, согласованной с генпрокурором Беларуси Григорием Василевичем, написано: "Опрос при проведении оперативно-розыскных мероприятий служит для выдвижения следственно-оперативных версий и разработки оптимальных вариантов действий по их проверке".

Стоит запомнить, что опрос на "детекторе лжи" проводится только с добровольного разрешения опрашиваемого. А в ходе "беседы под полиграф" опрашиваемый может в любой момент отказаться от "разговора по душам".

Материалы опроса в подразделении, которое его проводило, будут храниться на протяжении трех лет.

Результаты опроса имеют вероятностный характер.

Информация, полученная в ходе опроса с применением полиграфа, не может использоваться в качестве доказательств.

Словарь

Опрос с использованием полиграфа представляет собой проводимую по специальным методикам беседу с человеком, при которой фиксируются его психофизиологические параметры и реакции с последующей оценкой эмоционального напряжения на предъявляемые вербальные и невербальные раздражители.

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

КРЫМІНАЛ

Ліпавыя даведкі — сур'ёзная справа

Аператыўнікі Гродзенскага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю выкрылі групу медыцынскіх работнікаў, якія выдавалі даведкі аб прыгоднасці да кіравання транспартным сродкам вадзіцелям, што не прайшлі камісію.

Як паведамляе афіцыйны інтэрнет-сайт Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі, у пачатку 2008 года загадчыца аддзялення адной з гродзенскіх паліклінік выпісала меддаведку без правядзення медыцынскага агляду і была затрымана пры атрыманні хабару ў 20 долараў ЗША.

Потым высветлілася, што ў 2006--2007 гадах загадчыца аддзялення паліклінікі і трое іншых супрацоўнікаў неаднаразова выдавалі даведкі вадзіцелям, якія не прайшлі камісію. Пры гэтым медыцынскімі работнікамі незаконна выкарыстоўвалася пячатка вадзіцельскай медыцынскай камісіі для засведчання адпаведных даведак. Устаноўлены іншыя медработнікі, якія займаліся пошукам жадаючых атрымаць даведкі без праходжання камісіі. Яны таксама з'яўляліся пасрэднікамі ў перадачы хабару.

Усяго, пачынаючы з другой паловы 2006 года, гродзенскія медыкі выдалі больш за 40 даведак аб прыгоднасці да кіравання транспартным сродкам вадзіцелям, якія не прайшлі камісію. Агульная сума хабару склала больш за 2 мільёны рублёў. На падставе гэтай інфармацыі пракуратурай Гродзенскай вобласці распачаты 42 крымінальныя справы.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.

"Дурная куля" стала смяротнай

У раёне ракі Днепр у Буда-Кашалёўскім раёне на пашы для жывёлы вучань 10-га класа адной са школ Гомеля выпадкова застрэліў 18-гадовага хлопца, жыхара вёскі Чабатовічы Буда-Кашалёўскага раёна.

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры Буда-Кашалёўскага раёна, выстрал быў зроблены з незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы. Падлетак узяў яе ў заграджаным стане і націснуў на курок у той момант, калі зброя была накіравана ў бок 18-гадовага хлопца. Прагучаў выстрал, малады чалавек быў паранены ў паяснічную вобласць і памёр на месцы. Пракуратура праводзіць следчыя дзеянні, высвятляе абставіны трагедыі.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

У Беларусі будзе пабудавана 118 ферм

На будаўніцтва ў Беларусі 118 малочна-таварных ферм, аснашчаных сучасным абсталяваннем, выдзяляецца 1 трыльён ільготных крэдытных рэсурсаў. Аб гэтым паведаміў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па справах інвестыцый і арганізацыі будаўніцтва Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Андрэй Пракапчук.

ЗАКУЛИСЬЕ

Бедных просят не беспокоиться

Белорусское ГАИ с гордостью сообщило: в стране зарегистрирован первый автомобиль марки "Феррари", а если точнее – "Феррари" F-430. Новенький, 2008 года выпуска. Никакой сенсации в этом не было бы, если бы стоимость такого авто не приближалась к 200 тысячам долларов.

Значит, все-таки есть у нас богатые люди! И несмотря на то, что государство вещает об отсутствии социального расслоения, не замечать его уже невозможно.

"Бентли" погоняет "Майбах"

"Майбах" – это не просто машина, это причастность к элите, к избранным, это дань положению, которое обязывает. Эти авто никогда не были общедоступны и во всех странах мира на них ездят только самые богатые люди. Автомобиль собирается вручную, стоит огромных денег и выпускается только под заказ. В очереди за одним таким авто, если верить прессе, стоит не меньше полусотни миллионеров мира. Среди счастливых владельцев – шейхи из арабских стран, нефтяные магнаты, звезды мирового шоу-бизнеса... И двое... белорусов. По крайней мере, так утверждает белорусское ГАИ.

Впервые новый "Майбах", выпущенный под крылом легендарной немецкой компании "DaimlerChrysler" ("Мерседес"), был представлен на автосалоне в Токио в 1997 году, а уже в 2003 году такое авто появилось в Беларуси. Если учесть, что выпуск их ограничен, и что даже зачислиться в ряды потенциальных покупателей этого автомобиля непросто – нужно ждать как минимум год, то можно считать, что наши люди к роскоши приобщились очень быстро.

И чудо это, между прочим, стоит в зависимости от модели. В отличие от других автомобилей, которые могут иметь несколько десятков разных моделей, у этой марки их всего две – "Майбах-57" и "Майбах-62". Подобно яхтам, они измеряются только в метрах: "Майбах-57" покороче – 5,72 метра, "Майбах-62" – 6,16 метра. Соответственно стоимость авто базовой комплектации "Майбах-57" – 320 тысяч евро, "Майбах-62" – 380 тысяч евро.

Это так называемые заводские цены. Со всеми дополнительными функциями, обозначенными в отдельном прайсе, стоимость "Майбаха" порой зашкаливает за миллион долларов. И можно только догадываться, как разбирались с белорусской налоговой их владельцы, и какое уж такое особое положение они занимают, но тем не менее позволили себе приобщиться к миру великих. Впрочем, как и хозяева представительниц еще одного шикарного автомобильного бренда – "Бентли".

Согласно сведениям все той же белорусской Госавтоинспекции, четыре наших соотечественника ездят именно на "Бентли", два из которых совсем новенькие, 2007 года выпуска.

"Бентли" – это легендарная аристократическая марка, которая с первых дней своего существования входит в число самых престижных авто и, между прочим, тоже производится только на заказ. Особенно их любят артисты и спортсмены, но в Беларуси нет ни своей Софии Ротару (которой, кстати, это авто подарили), ни Максима Галкина, а вот "Бентли" есть. Даже четыре! Хотя стоимость их тоже вводит в ступор – 300 тысяч долларов. То есть даже если белорусское правительство когда-нибудь выполнит свое обещание и доведет зарплату в стране до 1000 долларов в месяц, то среднестатистическому гражданину надо будет не есть и не пить 300 месяцев – 25 лет! – чтобы хоть помечтать о таком автомобиле.

Но несреднестатистических у нас уже тоже немало. К примеру, в Беларуси уже 42 автомобиля "Хаммер". Их стоимость, конечно, поскромнее – около ста тысяч, а подержанные можно купить даже дешевле. Но кому-то же тянут деньги карман, чтобы покупать эту "боевую машину VIP-пехоты".

"Но куда же у нас ездить на таких "банковских сейфах"? – может спросить человек неосведомленный. Оказывается, в Минске уже очень много мест, рассчитанных исключительно на богатых людей.

В ТЕМУ

Вы не знакомы с Тони и Гаем?

В хорошем авто желательно бы хорошо выглядеть. И тут свои услуги предлагает, пожалуй, самый дорогой салон города "Toni&Guy". Он без лишнего шума и пафоса, а в режиме закрытой вечеринки открылся в отеле "Европа".

Обещают, что стрижки, сделанные здесь, не надо укладывать. Что они каким-то чудом будут держаться на голове так, будто вы только-только вышли от мастера. Здесь на вас заводят карточку и при следующем посещении уже не спрашивают, какой сорт чая вы предпочитаете. Здесь светлая кожаная мебель, приветливые администраторы, здесь нет парикмахеров, а только стилисты и топ-стилисты... Но и плата соответствующая.

Мужская стрижка с укладкой обойдется: у стилиста – от 113 тысяч рублей, у топ-стилиста – от 124 тысяч, у арт-директора – от 136 тысяч. Женская стрижка с укладкой: у стилиста – от 70 до 100 долларов, у топ-стилиста – от 80 до 120, у арт-директора – от 90 до 125. Если вам еще нужно окрасить волосы, то смело добавляйте 50--70 долларов сверху.

"Это без стоимости препаратов", – вежливо предупредила меня администратор. Кстати, ее собственная прическа, на мой взгляд, выглядела совершенно обычно.

Впрочем, против "Toni&Guy" я лично ничего не имею – это очень известный и респектабельный парикмахерский бренд. Говорят, в любом из салонов сети, независимо от того, в каком городе мира ты в него попал – в Лондоне, Минске или Токио – обслуживание будет одинаково качественным. Но появление салона в нашем городе – дополнительное свидетельство того, что в нем есть достаточно людей, которые могут себе позволить выложить за прическу 200 долларов.

Рыбак рыбака видит издалека

В бомонде его называют Миша. Хотя настоящее имя – Миодраг. Он серб. И он сегодня самый модный минский ресторатор.

Ресторан Porto Maltese, открывшийся на улице Козлова, – это воплощение отечественного гламура. Достаточно сказать, что при его открытии минский бомонд бесплатно пил Creme de Paris и гадал, как хозяевам удастся выполнить обещание о свежих средиземноморских устрицах.

Все оказалось просто. Рыбу в ресторан привозят в специальных контейнерах со льдом самолетом из Рима. О некоторых видах, уверена, многие минчане раньше даже не слышали: тюрбо, дорадо, меру, солнечник, скат, барабулька, морской язык, морской волк, морской черт, морской петух... И все это, как уверяет шеф-повар серб Никола Степанович, никогда не замораживают. Он даже проводит кулинарные шоу у себя на кухне, чтобы посетители могли сами убедиться, как творятся кулинарные шедевры.

Да, здесь все дорого. Но минчан, оказывается, это не смущает. Более того, заведение настолько популярно, что хозяева намерены открыть второй такой же ресторан – на улице Октябрьской, в районе концертного зала "Минск". И обещают, что там тоже все – и повара, и официанты – будут сербами.

Кстати, учредитель сети ресторанов и самого бренда Porto Maltese Душан Радович, родом из Герцег-Нови, начинал карьеру рыбаком. Так что не надо смущаться тем обстоятельством, что большинство из нас вынуждено проходить мимо подобных заведений.

Не для посторонних

В Porto Maltese накормят любого, лишь бы деньги были. Но, как выясняется, в Минске уже есть места, куда человеку с улицы попасть можно не всегда или никогда. Это VIP-клубы закрытого типа, где встречаются и развлекаются те, кто не любит посторонних глаз. О них, впрочем, очень сложно рассказывать, потому что по известным причинам они себя не афишируют и не рекламируют.

До недавнего времени таким был клуб X-Ray. Он находится в самом центре города, но в стороне от посторонних глаз: между Дворцом Республики и бывшей гауптвахтой, в районе улицы Герцена. Но чтобы найти его, надо постараться. Или знать. Клуб был задуман как закрытая дискотека для состоятельных молодых людей и в таком статусе просуществовал год. Теперь, правда, здесь все стало более демократичным.

Фактически закрытое для посторонних заведение – клуб "Спортинг". Если вы будете ехать из Минска через Уручье в сторону аэропорта, то вечером увидите светящуюся дорожку, уходящую от основной трассы влево. Она и ведет к "Спортингу". Здесь очень любят бывать чиновники и близкие к ним бизнесмены.

Кстати, закрытым считался и "Мир фитнеса", но клубу, похоже, не удалось избежать наплыва охотниц за мужьями, и потому серьезные VIP-клиенты начали уходить.

Для размышления

По итогам подачи деклараций о доходах за прошлый год Министерство по налогам и сборам объявило, что в Беларуси есть два долларовых миллионера: по крайней мере, именно такие состояния задекларировали житель Бреста и житель Минска. Фамилии их, естественно, налоговики не разглашают. Судя по появлявшейся в СМИ информации о размерах гонораров, миллионные состояния имеют некоторые белорусские спортсмены – Максим Мирный, Александр Глеб, Владимир Самсонов... В общем, если очень хорошо считать, то с большими натяжками к легальным миллионерам в Беларуси можно отнести человек десять.

Но богатых людей действительно становится все больше и больше. И это хорошо. Плохо, что бедных становится не меньше, а, наоборот, все больше и больше. Миллионы людей едва сводят концы с концами.

Ирина МАЛЬЦЕВА.

У Бешанковічах пабудуюць ГЭС

Рашэннем урада Беларусі наступным годам запланаваны пачатак будаўніцтва першай у краіне гідраэлектрастанцыі на вялікай рэчцы. Магутнасць будучай АЭС павінна дасягнуць 124 МВт. Замоўцам праекта, які павінны рэалізаваць у 2012 годзе, выступае РУП "Віцебскэнерга".

Пад вадасховішча будзе адведзена плошча каля 2 тыс. квадратных кіламетраў. У ходзе будоўлі ўзвядуць тры дамбы, два масты, шэраг іншых збудаванняў, у тым ліку і шлюз, які дазволіць зрабіць кавалак Заходняй Дзвіны ад Віцебска да Полацка судаходным нават для даволі вялікіх рачных караблёў, бо ягоная глыбіня павялічыцца ў сярэднім да 6--7 метраў.

Максімум, на які пагадзіліся ўлады

У верасні ў Віцебску, падчас святкавання Дня горада, адкрыецца мемарыяльная дошка, прысвечаная класіку беларускай літаратуры Васілю Быкаву, ураджэнцу Ушацкага раёна, які перад Вялікай Айчыннай вайной вучыўся ў нашым горадзе. Дакладная дата падзеі пакуль не вядома (хутчэй за ўсё другая палова верасня), але вельмі ўсцешвае, што віцебскія ўлады, нарэшце, ажыццявяць гэты праект, які па невядомых прычынах адцягвалі некалькі гадоў.

Беларускія гасцініцы самі сабе прысвойвалі «зоркі»

Наяўнасць "зорак" у гасцініцах Беларусі павінна быць пацверджана сертыфікатам адпаведнасці. Такое патрабаванне будзе дзейнічаць у рэспубліцы з 15 ліпеня 2008 года ў адпаведнасці з пастановай Камітэта па стандартызацыі Беларусі №51. Пра гэта БЕЛТА паведаміла вядучы інжынер аддзела сертыфікацыі прадукцыі і паслуг Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Людміла Бокуць.

Справа ў тым, што цяпер у Беларусі можна знайсці гасцініцы, якія самі сабе прысвоілі пэўную катэгорыю "зоркавасці", не маючы пры гэтым сертыфіката. У той час як існуюць патрабаванні да кожнай катэгорыі гасцініц, нумароў "люкс", першай, другой, трэцяй, чацвёртай катэгорый, паслуг, якія прадастаўляюцца.

У Беларусі сёння 18 гасцініц, якія маюць сертыфікаты на катэгорыю тры, чатыры і пяць "зорак". Прыкладна такая ж колькасць гасцініц прайшла папярэднюю праверку ступені гатоўнасці да сертыфікацыі і класіфікацыі. Цяпер яны ліквідуюць неадпаведнасці дзеючым патрабаванням, якія былі выяўлены ў ходзе праверак, і рыхтуюцца да атрымання сертыфіката.

Людміла Бокуць растлумачыла, што сертыфікацыя гасцініц і атрыманне катэгорый – справа добраахвотная. "Але калі гасцініцы хочуць мець "зоркі", то павінны атрымаць пацвярджэнне адпаведнасці патрабаванням, устаноўленым для названай катэгорыі. І гэта павінен зрабіць трэці незалежны бок – акрэдытаваны орган па сертыфікацыі паслуг, які пацвердзіць, што гасцініца сапраўды адпавядае патрабаванням стандарту, і выдасць сертыфікат", – удакладніла спецыяліст.

Акрамя таго, цяпер органы дзяржнагляду будуць правяраць гасцініцы, якія аб'явілі аб тым, што ў іх ёсць адпаведная катэгорыя "зорак", не толькі на адпаведнасць стандарту, але і на наяўнасць у іх сертыфіката на катэгорыю. І калі гэтага няма, а "зоркі" на шыльдах гасцініц выконваюць толькі "дэкаратыўную" ролю, то да іх могуць быць прыменены адпаведныя санкцыі. Таму што кліент, які засяляецца ў гасцініцу з пэўнай катэгорыяй, мае права атрымаць там абсталяваны нумар і адпаведны набор паслуг. Пакуль жа не кожная гасцініца можа гэта прадаставіць.

Уладальнікам першага сертыфіката і катэгорыі "тры зоркі" ў Беларусі стаў гасцінічны комплекс "Нафтан" (г.Наваполацк). Затым у гэты пералік увайшлі: СП "Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр" ТАА, гасцініца "Планета", РУП "Гасцінічны комплекс "Юбілейны", гасцініца "Турыст" (г.Гомель), тры гасцініцы ДВУ НП "Белавежская пушча", гасцініца "Эрыдан" (г.Віцебск), гасцінічны комплекс "Арбіта" (г. Мінск), РУП "Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр "Сілічы", "Славіна Спорт" (г.Жлобін), "Турыст" (г.Бабруйск), "Кантынент" (г.Ліда). Катэгорыя "чатыры зоркі" прысвоена РУП "Атэль "Мінск", гасцініцам "Лучоса" (г.Віцебск) і "Вікторыя" (г.Мінск). Пяць "зорак" мае гасцініца "Еўропа".

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 ЛІПЕНЯ 2008 г.

На «Славянскім базары» будзе 1300 супрацоўнікаў органаў унутраных спраў

Пасля выбуху ў Мінску сачыць за бяспекай гасцей "Славянскага базару" будуць больш дбайна

"Будзе задзейнічана больш за 1300 супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, – распавёў начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Леанід Фармагей. – У розных месцах горада ў рэжыме рэальнага часу сітуацыю будуць адсочваць 53 стацыянарныя відэакамеры, акрамя таго, здымаць на відэа будуць нашы супрацоўнікі з машын без спецафарбоўкі".

14 тэлерадыёвяшчальных арганізацый запрошаны асвятляць «Славянскі базар»

Прадстаўнікі 14 тэлерадыёвяшчальных арганізацый з Расіі, Украіны, Казахстана, Малдовы, Кубы, Кітая і іншых краін запрошаныя для асвятлення фэсту.

У якасці ганаровага госця Белтэлерадыёкампанія запрасіла дырэктара дэпартамента тэлебачання Еўрапейскага вяшчальнага саюза Б'ёрна Эрыксена, распавялі ў прэс-службе.

Валерыя ЕСІНА.

Мастацкі дом «Tacheles» у Мінску

У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва праходзіць выстава берлінскіх мастакоў.

Нямецкія госці прывезлі ў Беларусь незвычайную фантастычную рэчаіснасць. "Стыль выставы да канца не вызначаны, але тое, што ўсе творы заслугоўваюць увагі, – бясспрэчна, – распавёў адзін з арганізатараў мерапрыемства мастак Алесь Радзім. – Бо яны напісаныя творчымі людзьмі, якія "варацца" у асаблівай і незвычайнай берлінскай атмасферы".

Беларускія гледачы змогуць убачыць каля дваццаці незвычайных твораў, напісаных рукамі сучасных мастакоў Нямеччыны, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі міжнароднага цэнтра мастацтваў "Kunsthaus Tacheles".

На адкрыцці прысутнічалі прадстаўнікі нямецкай і італьянскай амбасад, беларускія музыкі і, што асабліва важна, некаторыя аўтары прадстаўленых карцін.

Выстава будзе працаваць да 27 ліпеня.

Ніл ГІЛЕВІЧ

Дойдзем!

З кнігі «У ноч на Пакровы»

У выдавецтве "Кнігазбор" выйшла ў свет новая кніжачка вершаў народнага паэта Ніла Гілевіча под назвай "У ноч на Пакровы". Яна маленькая — 88 старонак, і наклад — усяго 100 экземпляраў. Таму "выйшла ў свет" — надта гучна сказана: мала хто з прыхільнікаў паэзіі зможа патрымаць яе ў руках.

Але пазнаёміцца хаця б з некалькімі вершамі — калі ласка! "Народная воля" дае вам, шаноўныя чытачы, такую магчымасць. Вы пазнаеце здаўна знаёмы голас улюбёнага паэта, які з неспакоем у сэрцы вядзе размову пра самае дарагое — лёс нашай Бацькаўшчыны. І верыць — праз боль, праз горыч, — што цемра развеецца і мы ўсё ж дойдзем да сваёй Беларусі!

Чым больш я на свеце...

Чым больш я на свеце і жыў і мадзеў —
ішачыў, цярпеў і змагаўся, —
тым болей да праўды дабрацца хацеў,
да праўды ўсім духам ірваўся.

З хлусні і з абману, з аблуды сляпой —
да праўды, да праўды штосілы!
Да самай вялікай, галоўнай, да той,
што кожнага лучыць з усімі.

І вось яна ўрэшце адкрылася мне —
нічым не прыкрытай паўстала.
У поўнай істоце. Ва ўсёй галізне.
...І праўда мяне зруйнавала.

Студзень 2007 г.

Розніца

Усе, што гавораць сягоння
пра лёс беларускае мовы,
дзеляцца на дзве палавіны:
на тых, каму баліць
і каму не баліць.

Тыя, каму не баліць, —
спакойна зусім
філасофствуюць і разважаюць,
аналізуюць і аргументуюць,
нават пішуць трактаты.
Ну, а тыя, каму баліць, —
у прыступе болю
кідаюцца ніцма на дол
і плачуць надрыўна,
і б'юць кулакамі зямлю...

Вось і ўсё, і ўся розніца
паміж тымі і тымі.

Травень 2007 г.

А маладых усё хапаюць...

А маладых усё хапаюць,
Усё хапаюць і хапаюць —
Па двух, па трох,
Па пяць, па дзесяць, —
Усё хапаюць і хапаюць,
І ў ізалятар запіхаюць,
І люта палкай лупяць-месяць,
Каваным ботам б'юць пад дых —
"Закону" вучаць маладых.

І зноў хапаюць і хапаюць,
А маткі бедныя ўздыхаюць
І горка плачуць: гора нам!
Але сваім арлам-сынам
Вымоў-папрокаў не кідаюць,
Бо добра ведаюць яны —
Калі ў пакутах слёзы роняць, —
Што толькі мужныя сыны
Іх гонар матчын абароняць.

Сакавік 2007 г.

Даруйце, мае дарагія...

Даруйце, мае дарагія:
стаміўся я ўжо гаварыць —
і ціха, і гучна,
і вусна, і ў друку, —
стаміўся. І ўсё ж паўтараю:
Браты мае! Сёстры мае!
Ды зразумейце ж нарэшце:
пакуль мы не зробім
дзяржаву сваю беларускай —
нічога не мецьмем, нічога:
ні годных заробкаў і пенсій,
ні людскіх бальніц і медпунктаў,
ні нават прыгожае песні...
А вы ўсё не верыце,
а вы ўсё яшчэ спадзяецеся,
што станеце жыць чалавечым жыццём
у небеларускай краіне...
Ах, мае дарагія,
мае дарагія!

Ліпень 2007 г.

І хочам...

Прасякліся з дзяцінства
Чужым, дурным, атрутным —
І хочам мець адзінства
У гэтым часе скрутным.

І заклікаем-клічам
Да ўсенароднай згоды —
Без мовы, без аблічча,
Без праўды, без свабоды.

***

Даруй, Гасподзь, і ты даруй-прабач,
Анёл далёкі мой, навек адзіны,
Што часам здрадна падступае плач
У горкіх роздумах пра лёс Радзімы.

Я чую, чую голас твой з нябёс:
"Табе няможна так! Не маеш права!
З любві і гневу, а не з плачу й слёз
Ва ўрочны час здзяйсняецца Дзяржава".

Кастрычнік 2007 г.

Зварот

Пакладзіце, братцы людзі,
вы руку сабе на грудзі,
пакладзіце! —
і сабе ж, насупраць ночы,
у душу, як Богу ў вочы,
паглядзіце!

І скажыце-адкажыце
на адзінае пытанне
адназначна:
бачна вам дарога ў жыццё,
на якой — выратаванне,
ці не бачна?

Як не бачна — Божа правы
назаве вам прыклад чыну —
дзейсны, годны,
як ад ганьбы і няславы
бараніць сваю айчыну,
край свой родны.

Калі зноскі ў сытым блудзе
і апошні трацяць сорам,
злыдні-зноскі, —
Каліноўскі хай вам будзе
чэсці й гонару узорам!
Каліноўскі!

2008.

Згадка пра паланез

Не перанесці...
Не вытрываць...
Сэрца заходзіцца. Млее ў грудзёх.
Сілы, здаецца, пакінуць вось-вось
і ператнецца дыханне...
Як жа так сталася?
Як жа так сталася, што без цябе
слухаю гэтую боскую музыку?
Сам. Без цябе.
Тваё крэсла пустае.
А помню: як трэба было мне,
як мусіў я пераглянуцца з табой,
каб убачыць, як ты
выціраеш хусцінкаю слёзы —
ад шчасця, што чуеш яе,
гэтую боскую музыку...
У тыя хвіліны
я сам быў бязмежна шчаслівы.
І ўдзячны бязмежна —
Радзіме, Табе і Агінскаму.

2006—2007.

РЭХА

Смяяцца нам ці плакаць, беларусы?

У Купалаўскім – "Пінская шляхта"

Вы верыце, што можна плакаць, гледзячы камедыю? Не, не толькі смяяцца да слёз у смешных да слёз сцэнах. Адчуваць ком у горле, вільгаць на вачах падчас вонкава вясёлых эпізодаў, тым болей – у сімвалічным, нечакана гераічным фінале фарсу-вадэвіля, які паставіў на Купалаўскай сцэне па знакамітай "Пінскай шляхце" В.Дуніна-Марцінкевіча рэжысёр Мікалай Пінігін.

Так, са школьнай пары мы памятаем класічную хрэстаматыйную п'есу, здавалася б, уздоўж і ўпоперак. Захапляемся яе каларытнай вобразнасцю, сатырычным бляскам, трапнасцю слова. Але, прызнаюся, нават ведаючы талент Пінігіна, ішла на адзін з нядаўніх прэм'ерных спектакляў не без некаторай апаскі: не прывядзі Бог убачыць хай сабе і дакладную, але не выходзячую за межы "этнаграфіі" пастаноўку (як тое, на мой погляд, здарылася калісьці з мележаўскімі "Людзьмі на балоце" ў кінафільме па аднайменным рамане – у адрозненне ад дагэтуль незабыўнага ўвасаблення на той жа Купалаўскай сцэне).

На шчасце, спектакль па "Пінскай шляхце" прымусіў згадаць лепшыя творчыя здабыткі галоўнага тэатра Беларусі – прыкладам, "Тутэйшых" Я.Купалы ў пастаноўцы таго ж Пінігіна. Брава, маэстра! Нескончоныя авацыі ў зале, глыбокае ўзрушэнне захопленых гледачоў... Гэта – трыумф сапраўднага мастацтва, якое і ў камедыйным жанры не вычэрпвае сябе чыста забаўляльнымі мэтамі, а прымушае глыбока перажываць, задумвацца аб многім, можа быць, самым істотным. І мяняць нешта ў саміх сабе...

Нагадаю, калі хто крыху забыўся, сюжэтную канву п'есы. Яна можа падацца, на першы погляд, зусім простай. У вёску сярод палескіх балот на разбор справы прыязджае станавы прыстаў Кручкоў. Перад тым двое шляхціцаў – Ціхон Пратасавіцкі і Іван Цюхай-Ліпскі пасварыліся-пабіліся з-за таго, што адзін абазваў другога "мужыком". Цяпер дзеці гэтых палескіх "Мантэкі і Капулеці" – Грышка і Марыся – з-за варагоўлі бацькоў ажаніцца не могуць. Цаной незлічоных штрафаў, паборaў, запалохвання Кручкоў замірвае абодва бакі, усе задаволены, ладзіцца шырокае вяселле. Вось нібыта і ўсё, і казцы канец. Можна зноў пускацца ў заліхвацкія скокі з трапнымі прыпеўкамі, якія суправаджаюць амаль усю сцэнічную дзею...

Але ж – не, не ўсё, далёка не ўсё! Бясслоўнай, але выразнай мовай пластыкі спектакль працягваецца да лагічнага фіналу, які (не варта выключаць) мог бы зрабіць сам Дунін-Марцінкевіч, калі б не драконаўская царская цэнзура, не жорсткі пераслед, якому падвяргаўся пісьменнік за тое, што разам з дачкой Камілай быў на баку вызвольнага паўстання 1863 года. Бяру на сябе дзёрзкасць не пагадзіцца з вядомым літаратурна-тэатральным аўтарытэтам, які ўгледзеў у спектаклі ўсяго толькі пародыю на несмяротную шэкспіраўскую трагедыю пра Рамэа і Джульету. На мой погляд, таленавіты рэжысёр Мікалай Пінігін даў узор глыбокага прачытання класікі, мастацкага пранікнення і ўвасаблення сутнаснасці таго, што хацеў сказаць творца з XIX стагоддзя не толькі свайму пакаленню, а і нам, сённяшнім, і тым, хто прыйдзе за намі.

Не было б іншага клопату ў гнанага ўладамі, зведаўшага турэмныя краты В.Дуніна-Марцінкевіча, як высмейванне тутэйшых Рамэа і Джульеты і выбрыкаў іх бацькоў. Мікалай Пінігін, здаецца, тонка адчувае гэта і ставіць ніякую не пародыю на трагедыю, а ў даходлівай, усімі ўспрымальнай, вясёлай вадэвільнай форме падае саму трагедыю нашага народа, усёй Беларусі – спляжанай, знявечанай, абрабаванай вякамі паняволення ў чужой імперыі.

Прыгледзімся бліжэй да персанажаў, што выведзены на авансцэну пісьменнікам і рэжысёрам, хоць і разведзеных у прасторы часу, але, падобна, злучаных аднадумствам. Каларытнейшыя вобразы прадстаўнікоў тагачаснай беларускай шляхты – здрабнелай, збяднелай, але не ў меру пыхліва-ганарлівай – выклікаюць не толькі паблажлівы смех. Ціхон Пратасавіцкі (у перакананўчым выкананні народнага артыста Генадзя Гарбука) – даўно мусіць жыць з улаской працы, як звычайны селянін. Ды памяць пра былую шляхецкую веліч у Вялікім княстве Літоўскім кідае яго – з-за мянушкі "мужык" – з кулакамі на крыўдзіцеля, але чамусьці зусім не перашкаджае пакорліва схіляцца-прыніжацца перад дробным расійскім чыноўнікам... І грозны, ваяўнічы з выгляду Іван Цюхай-Ліпскі (дакладнае пападанне ў ролю заслужанага артыста Аляксандра Падабеда!) перад тым жа кручкатворам робіцца кацянём. Тая ж самая метамарфоза адбываецца з "галантарэйным" да колікаў, няўдалым кандыдатам у Марысіны жаніхі Харытонам Куторгам (ну і вынаходлівы ж артыст Мікалай Кучыц на ўсялякія штучкі-прыдумкі). Тут у ганарыстых "паноў" увесь іх гонар нібыта ветрам здзьмула: дагаджаюць залётнаму начальніку, ловяць кожнае слова. І не толькі гатовы – аддаюць усё дазвання за адну толькі бачнасць "міласці" ашчаслівіўшай іх яснавяльможнай асобы.

Даўно паблытаўшы сапраўдны гонар з пустой, нікчэмнай ганарлівасцю, колішняя эліта дзяржавы загрузла ва ўзаемнай тузаніне, прыстасаванстве да "пераможцаў" і міжволі стала апорай той нялюдскай сістэмы, якая іх жа прыгнятае і знішчае, перш за ўсё духоўна. З нейкай дурной паслужлівасцю аддаюць шляхцюкі рабаўнікам ад улады сваё дабро, уласную годнасць і не заўважаюць, як у чужыя заграбучыя рукі сплывае зямля іх продкаў, Айчына, будучыня. Хіба няма гістарычнай віны гэтай "эліты", што, маральна струхнелая і раз'яднаная, яна падмяніла горды ваярскі дух продкаў мітуснёй міжусобіц і страціла такім чынам, разам з Вялікім княствам, незалежнасць Бацькаўшчыны?

Вось якія, далёка не вадэвільныя пытанні, кранае вадэвіль. У цэнтры яго – зноў-такі, пры ўсёй вонкавай фарсавасці, злавесная фігура тагачаснага расійскага "вертыкальшчыка" Кручкова, якога (міжволі тут просіцца слова геніяльна) іграе найвыдатнейшы майстар, даўно народны, а не ўсяго толькі "заслужаны", паводле афіцыйнай версіі, артыст Віктар Манаеў. Іграе не проста нейкага там нікчэмнага "вінціка" сістэмы, а само яе ўвасабленне, сутнасць, нутро – калі хочаце, сімвал. Не такая ўжо вялікая чыноўніцкая шышка, гэты станавы прыстаў. А ў адной асобе – і следчы, і пракурор, і суддзя (адвакат не прадугледжаны!), і самы што ні на ёсць вымагальнік-хабарнік ("карупцыянер" па-сучаснаму) – імем закона творыць беззаконне і здзек, вершыць людскія лёсы, як яго левая нага захоча. Правакуе варажнечу, сее злое насенне нянавісці з адной-адзінай мэтай: валадарыць – і рабаваць, рабаваць, рабаваць!

Кручкатвор Кручкоў у Манаева – сапраўдны віртуоз сваёй чорнай справы, вынаходлівы і хітры, нават таленавіты ў дасканалым умельстве дурыць людзей, ставіць іх на калені. Бязлітасны драпежнік, у залежнасці ад патрэбы, можа рыкаць па-львінаму, кідаць на ахвяр свой звераваты "омон" – дзесяцкага і соцкага. А можа быць іранічна-з'едлівым, нават дасціпна-жартаўлівым, а то і прыкінуцца паблажліва-лагодным, хоць да раны прыкладай. Пад ягоныя фальшывыя ўсмешачкі-жарцікі і расквечаныя беспадобнай трасянкай "маралі" кшталту "А січас я вас агарчу-у-у", "гэта ж угалоўнае прэступление", "за тое, што не бачылі, а патаму не маглі разняць дзярушчыхся" і г.д. пісарчук Пісулькін, бы аўтамат, штампуе, штампуе, штампуе паперкі на бясконцыя штрафы і паборы. І металічны дзвюхгаловы арол, здаецца, зараз зляціць з казённага стала і стане дзяўбці ўсіх прысутных...

...Нарэшце, загружаны да неба воз з "дарамі" пінчукоў і самім Кручковым рушыцца ў дарогу. А ў вёсцы вясельны загул плаўна перацякае ў масавую бойку: перад ад'ездам чыноўнік неўпрыкмет, спрытна падкідвае захмялелым вяскоўцам бярэмя дручкоў і нагаворы наконт таго, што нехта з іх зноў кагосьці абазваў "не шляхціцам". Так што напарадзе – новае разбіральніцтва. І новая спажыва!

Мясцовыя Рамэа і Джульета (ролі Грышкі і Марысі ў "маім" спектаклі з імпэтным гумарыстычным напалам выконвалі Ігар Пятроў і Вікторыя Чаўлытка) з чамаданамі збягаюць з гэтага бедлама-калатнечы, а мужыкі і шляхта, зраўняўшыся ў сваёй дурноце, таўкуць і лупцуюць адно аднаго, аж ашмёткі ляцяць. І толькі калі ўсе пападаюць без сіл, а потым пакрысе ачомаюцца і ўбачаць поле бою, то жахнуцца: што ж нарабілі, недавумкі, навошта, каму на карысць і радасць?! І стануць на калені, замольваючы сваю віну перад роднай зямлёй, а потым устануць, расправяць плечы і над прорвай цямрэчы, пакоры, страху ўзнімуць забытыя, але дарагія гербы сваіх славутых родаў і старажытных гарадоў. Успомняць, хто яны і дзеля чаго жывуць на зямлі...

...На выхадзе з тэатра заўважыла знаёмага літаратуразнаўцу, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Міхася Мушынскага, пацікавілася яго ўражаннямі.

– Магутная рэч! Вось што значыць удумнае дакрананне да вечна жывой класікі, раскадзіраванне яе глыбіннага сэнсу. Смех, жарты, спевы – мора асалоды акцёрам і гледачам! А праблемы – глабальныя, сучасныя.

Падзяліўся думкай і вядомы мастак Аляксей Марачкін:

– Даўно не адчуваў такога задавальнення і захаплення. Выдатна! І музыка, і харэаграфія, і мастацкае афармленне ў драздовічаўскіх традыцыях...

Дзякуй, купалаўцы! Даруйце за тое, "што не бачыла" другі склад выканаўцаў і не ўсіх назвала. Дадам толькі імёны навуковага кансультанта, кандыдата філалагічных навук Язэпа Янушкевіча, мастака-пастаноўшчыка Вольгі Мацкевіч, кампазітара Андрэя Зубрыча, харэографа Людмілы Фадзеевай. Вы паказалі на адным дыханні вялікі спектакль – урок, запавет і прадказанне. Тут ёсць над чым падумаць – і моцна-моцна.

Між іншым, у мяне прапанова: чаму б не зладзіць культпаход на "Пінскую шляхту" для нашых апазіцыйных дзеячаў, якія ну ніяк не выцерабяцца з багны бясконцых, часам даходзячых да фарсу разборак кшталту "хто глаўнейшы" і хто каму даў "гусака" ці "мужыка"? А можа, ім усё ж ачомацца, вырвацца з палону дробных амбіцый і стаць поруч, каб не аказалася ў палоне Бацькаўшчына? Каб сваім аўтарытэтам і адданасцю справе ўзнімаць дух суайчыннікаў, іх чалавечую годнасць і нацыянальную свядомасць, дапамагаць пазбаўляцца рабскай псіхалогіі.

Дык смяяцца нам ці плакаць, беларусы, над самімі сабой, над тым, што часцяком так неабачліва робім? Па-мойму, дык і тое, і другое. Галоўнае ж – не быць абыякавымі і думаць, як стаць іншымі і зрабіць іншым жыццё. На мой погляд, якраз пра гэта – новы купалаўскі спектакль. Як, дарэчы, прынцыповы, мужны артыкул Івана Сілівончыка "Абыдлячванне людзей вядзе да згубы незалежнасці" ў "Народнай волі", які я прачытала з ўдзячнасцю аўтару ў тыя ж дні і ўзгадваю ў сувязі з прэм'ерай у Купалаўскім зусім не выпадкова. Ну што, дарагія, паразумнеем?

З павагай –
Алена КАРПІЦКАЯ,
настаўніца.

Мінск.

Упершыню за 76 гадоў у Беларусі выйшаў ідыш-беларускі слоўнік

Ілюстраваны ідыш-беларускі слоўнік склаў адмысловец у вобласці мовы ідыш і рэстаўратар Аляксандр Астарух.

У 928-старонкавае выданне, аддрукаванае тыражом тысяча асобнікаў, уключана каля 25 тыс. слоўнікавых артыкулаў і 50 тыс. слоў. Праца над кнігай заняла 10 гадоў.

Гэты слоўнік з'яўляецца другім выданнем такога роду ў гісторыі краіны.

Мультфільм распавядзе пра старажытную Беларусь

Ідзе праца над кінапраектам"Аповесць мінулых гадоў", які з дапамогай невялічкіх мультфільмаў распавядзе пра паходжанне гербаў гарадоў Беларусі.

Ужо завершана праца над трэцяй часткай праекта, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца вядомы беларускі майстар анімацыйнага кіно Ігар Волчак. Увагу аўтараў новай стужкі прыцягнулі гербы Полацка, Шклова, Мазыра, Чэрвеня, Пружан, Навагрудка. Аўтары імкнуліся распавесці, як з'явіліся гербы гэтых гарадоў не толькі праз гістарычныя падзеі Беларусі – яны стараліся паказаць, як жылі старажытныя насельнікі гэтых гарадоў, чым яны займаліся, якія рамёствы развівалі, якімі гаспадарамі былі і што пакінулі нам у спадчыну.

...І дзеці пачулі спевы птушак

Вялікую партыю суперсучасных дарагіх слыхавых апаратаў для глухіх дзяцей Полацка і Полацкага раёна прывезла ў горад-пабрацім дэлегацыя з нямецкага Фрыдрыхсхафена.

Ужо можна казаць пра ўражальныя вынікі дабрачыннага праекта. Замежныя сябры зрабілі шчаслівай сям'ю палачанкі Алены Дабраселец. Атрымаўшы сучасны слыхавы апарат, сын Алены, гуляючы з мамай па горадзе, прызнаўся ёй, што ўпершыню пачуў, як шуміць вецер у галінах дрэў, а малодшая дачка Насця ўпершыню атрымала асалоду ад птушыных спеваў, якіх раней не магла чуць з-за прыроджанай хваробы слыхавога нерву і мусіла вучыцца ў адмысловай школе для глухіх дзяцей у Віцебску.

Госці з горада Фрыдрыхсхафена паабяцалі, што наступным разам прывязуць у Полацк яшчэ 20 слыхавых апаратаў сучаснага заходнееўрапейскага ўзору.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 ЛІПЕНЯ 2008 г.

«Ляпіс Трубяцкой» адмовіў «Адзінай Расіі»

Беларуская група "Ляпіс Трубяцкой" адмовілася выступаць у Маскве на фестывалі, арганізаваным праўрадавай партыяй "Адзіная Расія".

Як паведамляецца на афіцыйным сайце калектыву, у мінулую суботу высвятлілася, што фэст "Мега Біт", які праходзіць у Маскве ў рамках свята газеты "Маскоўскі камсамолец", спансіруе крамлёўская партыя ўлады "Адзіная Расія".

Паколькі група "Ляпіс Трубяцкой" ніколі не ўдзельнічала ў палітычна ангажаваных мерапрыемствах, выступ "Ляпісаў" на фэсце "Мега Біт" быў адменены.

Wi-Fi стаў платным

Бесправадны доступ у інтэрнет па тэхналогіі Wi-Fi стаў платным. Пра гэта паведаміла прэс-служба РУП "Белтэлекам".

На гэты момант толькі нацыянальны аператар электрасувязі "Белтэлекам" прадастаўляе паслугі бесправаднога доступу ў інтэрнет па тэхналогіі Wi-Fi – бясплатна ў рэжыме доследнай эксплуатацыі. З лета 2007 года па краіне арганізавана больш як сто хотспотаў (пунктаў доступу) з выкарыстаннем абсталявання дадзенага стандарта.

Як патлумачылі БелаПАН у РУП "Белтэлекам", з 7 ліпеня атрымаць доступ у інтэрнет па тэхналогіі Wi-Fi можна будзе з дапамогай картак доступу. Пакуль яны выпушчаны ў двух наміналах: 60 хвілін і 180 хвілін. Карткі Wi-Fi абодвух наміналаў можна набыць у сервісных пунктах, пунктах калектыўнага карыстання і сервісных цэнтрах "Белтэлекама". Кошт карткі наміналам 60 хвілін складае 1600 рублёў, наміналам 180 хвілін – 4000 рублёў. Для доступу ў інтэрнет неабходна сцерці ахоўны слой, пад якім указаны логін і пароль для аўтарызацыі.

Да ведама. Wireless Fidelity (Wi-Fi) – сучасная бесправадная тэхналогія падключэння камп'ютэраў да інтэрнета, заснаваная на выкарыстанні радыёхваляў. Wi-Fi-доступам могуць карыстацца ўладальнікі ноўтбука і кішэннага персанальнага камп'ютэра, веб-камеры і бесправаднога IP-тэлефона, аснашчаных адпаведным модулем. Тэхналогія Wi-Fi шырока выкарыстоўваецца для арганізацыі бесправаднога доступу да інтэрнета ў грамадскіх месцах: у кафэ, на вакзалах, у аэрапортах, на вуліцах.

Аляксей АРЭШКА.

«Улада далоў!» адышла ў Лету

У мюзікле "Рускі фантом" мінскага Тэатра музкамедыі хор больш не спявае "Улада далоў!" – замест гэтага гучыць нейтральнае "Усё далоў!".

Адна з супрацоўніц тэатра распавяла, чаму адбылася замена тэксту:

"Наш дырэктар, які з'яўляецца і рэжысёрам гэтага спектакля, пасля прэм'еры выклікаў спевакоў на рэпетыцыю і распарадзіўся замяніць словы. Яны прарэпеціравалі сцэну "Узурпатар", і на ўчарашнім спектаклі ўжо спявалі па-іншаму. Гэта значыць, што словы "Улада далоў!" былі замененыя на "Усё далоў!".

ПЕРСОНА

Лилия СТУДНЕВА:

«Я не эмансипированная, а, скорее, восточная женщина»

Представительница редкого для Беларуси жанра песенной поэзии Лилия Студнева, исполняющая песни на стихи Марины Цветаевой, Анны Ахматовой, сама похожа на поэтесс "серебряного века" – такая же тонкая, ранимая, но в то же время сильная.

О том, как после факультета прикладной математики оказалась на сцене филармонии, почему никогда не уедет за границу и почему не ходит в театр, Лилия рассказала "Народной воле".

– Как думаете, почему вас называют самой неформатной певицей белорусской сцены?

– Может, дело в том, что жанр, в котором я работаю, непривычен для белорусской сцены. У нас есть эстрада, опера, бардовская песня. Но жанра песенной поэзии, этакой театральной песни, в котором работает Елена Камбурова в России, у нас нет.

– Всегда ли вы занимались только музыкой?

– Я закончила факультет прикладной математики БГУ. Очень люблю математику и, несмотря на то, что мне всегда была интересна музыка и актерство, в детстве не мечтала стать артисткой. Но, закончив университет, я сразу перешла в другую сферу – пение, пластика, танцы, пантомима – и больше отсюда не уходила.

– Могли бы провести какие-нибудь параллели между математикой и музыкой?

– Конечно! Их роднит потрясающая гармония. Именно гармония всегда восхищала меня в математике. Числа могут быть ничуть не менее гармоничны, чем музыка. А ноты могут быть математикой. Но когда они наполняются душой музыканта, то это становится искусством.

– У вас есть постоянное место работы?

– Мое постоянное место работы – это свобода. Подготовила концерт, выступила здесь, выступила там - так и живу. Я свободный художник.

– Когда готовилась к интервью, с удивлением обнаружила, что о вас слишком мало написано…

– Работа моя проходила с большими творческими перерывами, связанными со здоровьем, с семьей... После большого концерта "Персияночка" в 1997 году я серьезно "поломалась". Долго пролежала в гипсе, заново училась ходить. Естественно, ни о каких песнях и танцах речи даже не шло. В 2006 году я вернулась на сцену. Уже прошли два моих больших концерта. Надеюсь, дальше все будет хорошо...

– О вас говорят как о певице, выгодно выделяющейся на фоне шаблонной, отформатированной и безвкусной белорусской эстрады. А как лично вы относитесь к нашим "шаблонистам"?

– Птицы все разные – они поют как умеют. И никто им не может запретить петь. Так и люди: хотят петь – пусть поют. Я никого не могу осуждать или критиковать. Все имеют право петь – и воробушки, и ласточки, и соловьи, и орлы, и вороны *(улыбается)*.

К тому же, если они поют, значит, у них есть свой слушатель и зритель. Не только спрос рождает предложение, но и предложение рождает спрос. Сцена сегодня – это чистой воды бизнес. Имеет смысл говорить больше даже не об артистах, а о проектах, в который вкладываются деньги, которые раскручиваются, и работают на то, чтобы вернуть вложенное...

– В наше время у исполнителя есть масса способов общения со слушателями, которых не было раньше: телевидение, интернет… Тем не менее у артистов остается потребность выходить на сцену, а у слушателей и зрителей - приходить на концерты. Насколько важны лично для вас встречи с публикой?

– Это самое главное! Работа в зале – это особенный уровень существования. Выступление "живого" артиста на "живого" зрителя не сравнить ни с чем: ты чувствуешь весь зал, а он откликается на каждую твою ноту, видит, где ты соврешь, где ты будешь искренна... Под "фанеру", конечно, ни смотреть, ни слушать неинтересно (смеется).

– В последнее время происходит просто филармонический бум – люди, ранее и знать не желавшие филармонию, ходят туда как на работу…

– Все просто – ренессанс. Это происходит не только в музыке, но и в театре, кино... Происходит заметное просветление, период тьмы заканчивается...

– Как часто вы бываете в театре или на концерте в качестве слушателя? Куда ходили в последний раз?

– В театры я перестала ходить много лет назад. Я знаю, что есть много чего хорошего, но боюсь проглотить червяка. Потому что бывало часто такое, когда после спектакля я выходила из театра больная – там происходило что-то такое, отчего я чувствовала себя эмоционально плохо. Единственный спектакль, который мне очень понравился, – "Больше чем дождь".

Концерт, на котором я была в последний раз, – вечер романса в исполнении Владимира Ткаченко и его супруги Елены. Это было чудное мероприятие, наполненное положительной энергетикой, пронизанное любовью...

– Не секрет, что многие певцы, артисты уезжают за границу в поисках местечка потеплее и помягче. Вам не хотелось сделать карьеру в Европе?

– У Игоря Талькова есть такие слова: солнце уходит на запад, но, чтобы снова родиться, спешит на восток. Я не способна строить жизнь и карьеру за рубежом. Есть кошки, которые привязываются к определенной территории, я – такая же. Я просто знаю, что мне будет плохо за границей.

– Вы испытывали когда-нибудь страх перед сценой?

– То, что я испытываю, – не страх. У артистов есть такое понятие, как кураж – специфическое волнение. Я как-то участвовала в концерте, который вел Михаил Ульянов. Я спросила, волнуется ли он. Он ответил: "Когда я перестану волноваться, то перестану быть артистом".

Без волнения нечего делать на сцене. Если человека не волнует запах кулис, то он равнодушен и ко всему остальному.

– Находясь на сцене, певица всегда старается впечатлить зрителей тем или иным способом. А в повседневной жизни как вы стараетесь произвести впечатление на окружающих?

– Мои близкие знают, что в обычной жизни я стремлюсь к уединению. Я с трудом переношу всяческие тусовки, люблю семью, природу... Я нешумный человек. И мне не впечатление произвести чаще хочется, а спрятаться куда-нибудь, чтобы меня никто не видел.

– Кто или что для вас самый строгий цензор – в музыке и в жизни?

– Я обязательно во всем и всегда советуюсь с мужем. Это касается музыки, стихов, концертов, даже костюмов. Однако окончательное решение принимаю я сама своим сердцем.

В жизни же я тише воды и ниже травы. Конечно, я имею собственное мнение, но в семье у нас главный – муж. Я порой за лидерство борюсь, но мне это, в общем-то, сто лет не нужно... Я не эмансипированная, а, скорее, восточная женщина.

– Ваш муж является также и вашим менеджером…

– Я бы даже не назвала его менеджером. Мы просто делаем все вместе. Я пою, а он мной занимается. Вся организаторская работа на нем. Как ни назови его, он главный: в одном лице все – и швец, и жнец. Только я – на дуде игрец *(смеется)*.

Ольга ПРУДНИКОВА.

Петра Елфимова ограбили в центре Минска

У певца украли все диски с фонограммами, без которых он не может выступать.

Как только Петр Елфимов и его директор Татьяна Космачева, выйдя из авто, скрылись в подъезде дома по улице Карла Маркса, неизвестные взломали дверь новенького "Пежо", который Елфимов выиграл на конкурсе "Две звезды". Пропали все диски, документы, пластиковые карточки, новые коврики для автомобиля и весь тираж флаеров артиста, напечатанных к "Славянскому базару".

По словам Татьяны Космачевой, оставившей в авто свою сумку с 500 долларами и очками от Нины Риччи, только в день ограбления была оформлена страховка.

"У нас концерты, – разводит руками Елфимов. – И что теперь делать, когда унесли все диски?!"

На снимке: *Машина певца, из которой воры унесли самое ценное.*

Валерия ЕСИНА.

Кай ОХРЭМ:

«Жадаю «Свабоднаму тэатру» працаваць у лепшых умовах і ў вольнай краіне»

Днямі ў рамках падпольнага фестывалю "Еўрапейскі тэатр беларускай публіцы", які ладзілі прадстаўнікі "Свабоднага тэатра", адбыўся паказ сацыяльнай нямецкай драмы "Нажніцы".

...Бацька згубіў працу, п'е, чым робіць жыццё сваіх родных невыносным. Маці мучыцца, але нічога не можа змяніць. Яна працуе, каб схавацца ад праблем. А маленькае, не патрэбнае бацькам, дзіця вырашае скончыць свае пакуты самагубствам.

Спектакль распавядае пра нямецкую сям'ю, але ж колькі іх такіх у Беларусі?

Натуралізм монаспектакля нібыта сцёр моўныя перашкоды...

Пра п'есу, мінскую публіку, падпольныя тэатральныя ўмовы і "Свабодны тэатр" рэпарцёр "Народнай волі" паразмаўляла з вядомым нямецкім рэжысёрам ***Каем Охрэмам.***

– Як распачалося ваша супрацоўніцтва з падпольным беларускім "Свабодным тэатрам"?

– З прадстаўнікамі "Свабоднага тэатра" мы пазнаёміліся на канферэнцыі ў Францыі. Абмяняліся dvd, пасябравалі і заўважылі, што па ўзроўні жыцця і менталітэце беларусы і немцы вельмі розныя, але што тычыцца тэатра – тут шмат агульнага. І праз некаторы час я атрымаў ад "Свабоднага тэатра" прапанову папрацаваць разам. Зімой я прыехаў у Мінск. Працаваў з акцёрамі месяц і ў выніку быў зроблены спектакль "Грум-грум", які паказваўся мінскай публіцы двойчы.

– Гэтым разам вы вярнуліся са спектаклем нямецкага тэатра па п'есе ўсё той жа Дэа Лоэр.

– Так. Гэта спектакль адной з самых вядомых сучасных пісьменніц у Нямеччыне, якая да таго ж мае агромністы патэнцыял. Дэа Лоэр – асоба проста неверагоднай працаздольнасці, бо стварыла значную колькасць спектакляў для вялікай сцэны. Пры гэтым яна мае добрае чуццё на тое, што зараз актуальна для нямецкай публікі. Апроч вялікіх форм яна піша і малафарматныя спектаклі, як, напрыклад, "Нажніцы". Яе творы абсалютна розныя, але ўсе вельмі сучасныя, хаця і розныя па стылі, жанру.

Тэмы дзіцячага самагубства і насілля над дзецьмі ў сем'ях, паднятыя ў "Нажніцах", даволі часта становяцца прадметам дыскусій у нямецкіх СМІ. Задума п'есы ў тым, каб яшчэ раз прасігналізаваць грамадскасці аб гэтых праблемах, прыцягнуць да іх увагу. Мне падалося, што менавіта такі спектакль будзе зразумелы гледачам "Свабоднага тэатра", і я не памыліўся.

– Для нашай публікі нязвыкла бачыць такія складаныя тэатральныя формы і прымаць удзел у самім спектаклі. "Нажніцы" былі паказаны ў Нямеччыне і Беларусі. Яго аднолькава прынялі на радзіме і ў нас?

– На самай справе беларуская публіка значна больш раскаваная. Я нават не чакаў, што ўсё так атрымаецца, што беларусы вельмі хутка ўвальюцца ў спектакль. Яны не толькі ўзялі прапанаваны артысткай адэкалон, напрыклад, але нават пачалі яго таксама распырскваць, перадаваць адзін аднаму. Немцы ж аддзяляюцца ад таго, што адбываецца на сцэне. І адэкалон браць не хочуць, доўга думаюць, што рабіць, ёрзаюць на стуле.

– Спекталь ідзе з сінхронным беларускім перакладам. Ці не перашкодзіў моўны бар'ер правільна зразумець ягоную асноўную думку?

– Пасля спектакля ў Мінску да нас падыходзіла вельмі шмат людзей. Людзі дзякавалі нам на ўсіх мовах. І гэта вельмі цешыць. Таму мне падаецца, што нашу працу зразумелі правільна.

– У нас на пастаноўкі "Свабоднага тэатра" ў асноўным ходзіць адукаваная і дапытлівая моладзь. Хто наведвае нямецкія тэатры?

– У Нямеччыне тое ж самае. Каб прыйсці на "Нажніцы", трэба разумець, што адбываецца ў краіне.

– Спектакль "Нажніцы" ставілі не на тэатральнай сцэне, а ў самым звычайным будынку. Як лічыце, "Свабоднаму тэатру" ідуць на карысць падпольныя ўмовы?

– Я не лічу добрым тое, што людзі не маюць нармальнай магчымасці ставіць спектаклі, пастаянна адчуваюць пэўны ціск, напружанне... Я жадаю "Свабоднаму тэатру" працаваць у лепшых умовах і ў вольнай краіне.

Аля ВЯТРОЎСКАЯ.

Купалле магчыма адсвяткаваць і ў горадзе

Днямі ў Мінску прайшла імпрэза "Таямніцы Купалля".

Купалле – самае чароўнае і містычнае беларускае свята. Яно і дагэтуль ўтрымлівае ў сваім адзначэнні безліч архаічных язычніцкіх свят. Моладзь і зараз выязджае на прыроду, каб весяліцца, святкаваць, шукаць папараць-кветку. А што, калі немагчыма выехаць з горада?

У горадзе таксама ладзіцца мноства мерапрыемстваў на любы густ: афіцыйныя, нефармальныя, нефарматныя і тыя, што задаволяць людзей рознага ўзросту. Менавіта такімі былі "Таямніцы Купалля", што арганізавала УП "Скарбніца", якое займаецца традыцыйнымі беларускімі рамёствамі ўжо больш за 30 гадоў.

У праграме свята на вольным паветры шмат месца заняло нацыянальнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Напрыклад, майстар-клас саломапляцення выбітнай мастачкі і выкладчыцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта Любові Селівончык. Яна асцярожна бярэ кожную саломінку, якая спрытна слізгае паміж працавітых пальцаў майстрыхі і літаральна за некалькі хвілін ператвараецца ў залаты званочак.

Пад электраапрацоўкі беларускай музыкі маладыя дзяўчаты дэманстравалі сцэнічныя касцюмы, зробленыя "Скарбніцай" па матывах народных строяў Маларыцкага раёна Брэстчыны. За імі – аўтарскія калекцыі мастакоў. Гэта ўжо сапраўднае этнадэфіле, дзе спалучыліся вытанчанае белае футра з вышыўкай і тканыя спадніцы.

Натуральна, што Купалле не можа абысціся без музыкаў. Усіх прысутных парадаваў сваім выступам неафолкавы гурт "Рокаш", вакалістка якога маладая маці Паліна прыйшла на канцэрт са сваім дзіцем, чым вельмі расчуліла публіку.

А на заканчэнне "Скарбніца" прыхавала сюрпрыз. Наведнікі "Таямніцаў Купалля" першымі дазналіся пра адкрыццё мастацкай галерэі на базе цэнтра рамёстваў.

Аля ВЯТРОЎСКАЯ.
Фота Наталлі КІРУШЫНАЙ.

НУ І НУ!

Найлепшы футбольны арбітр Беларусі судзіў матч п'яным?

Скандал разгарэўся пасля матча трынаццатага тура чэмпіянату Беларусі па футболе паміж "Віцебскам" і наваполацкім "Нафтанам". Як высветліў журналіст газеты "Прэсбол" Аляксандр Шыловіч, арбітр матча Сяргей Шмолік быў п'яным.

Вынік экспертызы – 2,6 праміле алкаголю ў крыві. Норма для кіроўцы аўтамабіля ў Беларусі складае 0,5 праміле. Такім чынам, узровень алкаголю быў перавышаны ў пяць разоў. Шмолік паспрабаваў апраўдацца тым, што выпіў ужо пасля гульні, але накачацца за невялікі тэрмін да такіх лічбаў папросту немагчыма.

Берасцеец Сяргей Шмолік з'яўляецца адным з найлепшых беларускіх арбітраў: апроч матчаў беларускага першынства (тут ён адсудзіў 247 гульняў), суддзя абслугоўвае сустрэчы міжнароднага значэння – еўракубкі, матчы зборных. Таму такі інцыдэнт кладзецца чорнай плямай на рэйтынг беларускага футбола і ў міжнародным кантэксце.

Летась Беларускай федэрацыяй футбола Шмолік быў прызнаны найлепшым айчынным суддзёй года.

У панядзелак судзейскі камітэт БФФ прыняў рашэнне не прызначаць Сяргея Шмоліка на матчы нацыянальнага першынства да высвятлення ўсіх абставін. Такога ў гісторыі беларускага футбола яшчэ не было ніколі.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 8.07.2008 у 13.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №